Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

ОРГАН САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ І УПРАЎЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВА ПРЫ СНК БССР

№ 22 (545) | Аўторак, 6 лістапада 1945 г. | Цана 50 кап.

2. Всесоюзная библиотека имени В. И. Ленина

Таварышу Андрэю Андрэевічу Андрэеву

Цэнтральны Камітэт Усесаюзнай Камуністычнай Партыі (большэвікоў) і Совет Народных Камісараў Саюза ССР горача вітаюць Вас, выдатнага дзеяча Камуністычнай партыі і совецкай дзяржавы — у дзень Вашага пяцідзесяцігоддзя.

Ад усяго сэрца жадаем Вам, дарагі Андрэй Андрэевіч, шмат год здароўя і плённай працы на карысць совецкай Радзімы.

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ УСЕСАЮЗНАЙ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ (большэвікоў)
СОВЕТ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ САЮЗА ССР.

НЯХАЙ ЖЫВЕ 28-я ГАДАВІНА ВЯЛІКАЙ КАСТРЫЧНІЦКАЙ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭВОЛЮЦЫІ!

* * *

28-ая гадавіна Кастрычніка

Наступіў дзень вялікага свята— 28-ая гадавіна Вялікай Кастрычніцкай Соцыялістычнай рэволюцыі.

Гэта першая гадавіна, якую совецкі народ адзначае, пасля чатырох гадоў упартай і напружанай барацьбы, у мірнай абстаноўцы.

Чатыры годы ішла цяжкая, крывавая барацьба за чэсць, свабоду і незалежнасць нашай Радзімы. І совецкі народ выйшаў пераможцам. На захадзе — разгромлена фашысцкая Германія, якая запаліла пажар сусветнай вайны ў Еўропе, на ўсходзе — разбіты і прымушаны да капітуляцыі японскі агрэсар, падпальшчык вайны ў Азіі і на Далёкім Усходзе.

Совецкі Саюз разам з сваімі саюзнікамі святкуе поўную і канчатковую перамогу.

За чатыры ваенныя годы нашым людзям давялося перанесці цяжкія нягоды і выпрабаванні. Сур'ёзная небяспека пагражала нашай Радзіме. Але совецкі народ у гэтыя моманты яшчэ цясней згуртаваўся вакол вялікай партыі Леніна—Сталіна, вакол свайго палкаводца і правадыра таварыша Сталіна. Мы непахісна верылі ў мудрыя і прадбачлівыя сталінскія словы аб тым, што вораг будзе разгромлены і мы пераможам.

Чырвоная Армія і ўвесь совецкі народ у барацьбе з германскім імперыялізмам праявілі ўзоры нябачанай мужнасці, стойкасці, гераізма. «Верныя запаветам вялікага Леніна, не шкадуючы сіл і жыцця, абаранялі яны заваёвы Кастрычніцкай рэволюцыі. Як вядома, гэтыя намаганні арміі і народа не прапалі дарэмна» (Сталін).

Многа цяжкіх разбурэнняў пакінулі нам фашысцкія захопнікі на зямлі, якую яны часова акупіравалі.

Цяпер совецкі народ нястомна працуе над аднаўленнем разбураных гарадоў і вёсак, адбудовай фабрык і заводаў, калгасаў, школ, больніц, тэатраў другіх культурных устаноў.

За невялікі час зроблена шмат. Бо і мірнай будаўнічай працы, як і ў змаганні на франтах Айчыннай вайны, ды людзі паказваюць узоры нябачанага гераізма і адданасці вялікай справе соцыялізма.

У чым прычына гэтых велічных поспехаў совецкай краіны, як ва ўзброенай барацьбе супроць захопнікаў-імперыялістаў, так і ў мірным будаўніцтве?

Маральна-палітычнае адзінства нашага народа, непахісная дружба і давер'е, якое існуе паміж усімі народамі, што насяляюць совецкую зямлю,— з'яўляюцца асновай нашай магутнасці. Усе народы совецкай краіны з найвялікшай любоўю ставяцца да свайго старэйшага брата — вялікага рускага народа, які першы сярод народаў былой царскай Расіі ўзняў сцяг соцыялістычнай рэволюцыі і які ў дні Айчыннай вайны зноў праявіў свой ясны розум, стойкі характар і цярплівасць. Наша краіна цяпер рыхтуецца да выбараў у Вярхоўны Совет СССР. Гэтыя выбары яшчэ раз прадэманструюць непахісную сілу совецкага лада, маральна-палітычнае адзінства совецкага народа, згуртаванасць вакол большэвіцкай партыі і яе Цэнтральнага Камітэта.

У закліках да 28 гадавіны Вялікай Кастрычніцкай Соцыялістычнай рэволюцыі ЦК ВКП(б) звяртаецца да работнікаў совецкай літаратуры і мастацтва з такімі словамі: «Работнікі совецкай літаратуры і мастацтва! Стварайце творы, вартыя вялікага совецкага народа!» Абавязак нашых пісьменнікаў, акторaў, кампазітараў, мастакоў адказаць на гэты заклік сталінскага Цэнтральнага Камітэта яшчэ больш напружанай працай па стварэнню новых кніг, спектакляў, музыкальных твораў і твораў выяўленчага мастацтва, вартых вялікага совецкага народа.

Вітаем і віншуем вас, дарагія таварышы, з светлым святам — 28-ай гадавінай Вялікай Кастрычніцкай Соцыялістычнай рэволюцыі!

Няхай жыве вялікі Совецкі Саюз— надзейная апора шчасця і славы народаў нашай Радзімы!

Няхай жыве Усесаюзная Камуністычная партыя большэвікоў—натхняцель і арганізатар нашых перамог!

Няхай жыве правадыр совецкага народа — вялікі Сталін!

Пад сцягам Леніна, пад вадзіцельствам Сталіна — наперад да новых поспехаў соцыялістычнага будаўніцтва!

ІЛЬЯ ГУРСКІ

Кастрычнік 1941 года

Нас было пяць чалавек беларускіх пісьменнікаў: Максім Танк, Пімен Панчанка, Алесь Кучар, Васіль Барысенка і аўтар гэтага артыкула, што напярэдадні 24-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай Соцыялістычнай Рэволюцыі апынуліся ў гор. Варонежы. Мы выдавалі газету «За совецкую Беларусь» — Орган Палітупраўлення Бранскага фронту.

Трывожны тады быў час. Помню, калі прыехалі мы ў гор. Варонеж, на радзіму славутага Кальцова і Нікіціна, у нас не было нічога акрамя невялікай колькасці рукапісаў. Варонежскі Абком ВКП(б) прыняў нас, як сваіх людзей, накіраваў у лепшую ў горадзе друкарню, адвёў у рэдакцыі абласной газеты нам месца для работы, забяспечыў патрэбнай колькасцю паперы, і мы прыступілі да працы. Да рэчы, тады ў гор. Варонежы друкаваліся на матрыцах «Правда» і «Красная Звезда», шмат выдавалася франтавых газет і ў прыватнасці газета «За радяньску Украіну», з паперай было нялёгка, але нам яе далі.

Цяжкія гэта былі дні. Немцы захапілі большую частку Украіны, Беларусь, Малдавію, Літву, Латвію, Эстонію, рад другіх абласцей, былі ўжо ў Данбасе, навіслі над Ленінградам, пагражалі Маскве. Мы добра ведалі, што нашы браты ў захопленай Беларусі і іншых абласцях нашай совецкай краіны стогнуць пад прыгнётам нямецкіх акупантаў, што гітлераўцы забіваюць мірных людзей, жанчын, дзяцей і старых. Гэта павялічвала нашы пакуты, ўзмацняла нянавісць да ворага. Мы прагнулі працы, каб дапамагчы Комуністычнай партыі падняць беларускі народ на барацьбу супроць акупантаў, якія парушылі мірнае жыццё людзей.

6-га лістапада перадсвяточны нумар газеты «За совецкую Беларусь» быў гатоў. Мы адправілі яго на аэрадром для засылкі на родную зямлю, а самі з нецярплівасцю чакалі выступлення таварыша Сталіна, мяркуючы выдаць спецыяльны нумар з дакладам правадыра. Мы з напружаннем, усе пяць чалавек, чакалі на сходках лесвіцы, каля рэпрадуктара, што скажа Іосіф Вісарыёнавіч. Народу было шмат. Доўжыўся час. Нарэшце, мы пачулі знаёмы, блізкі сэрцу, спакойны голас таварыша Сталіна, які падагуліў ход вайны за чатыры месяцы, абгрунтаваў правал «маланкавай вайны», высветліў прычыны часовых няўдач нашай арміі, раскрыў, хто такія «нацыянал-соцыялісты», з усёй сілай і пераканальнасцю давёў, што разгром нямецкіх імперыялістаў і іх армій немінучы, і паставіў перад совецкім народам і яго ўзброенымі сіламі неадкладныя, баявыя задачы.

Даклад таварыша Сталіна зрабіў на нас усіх моцнае ўражанне. Помню, мы тады яшчэ гаварылі, што ён роўназначны выйгрышу велізарнейшай бітвы. Не хаваючы ад народа смяротнай небяспекі, якая навісла над краінай, таварыш Сталін пераканаўча давёў, што: «Наша справа справядлівая, — перамога будзе наша!»

Перш за ўсё нам хацелася як найхутчэй давесці неўміручыя словы таварыша Сталіна да свайго народа, які пакутаваў у нямецкай няволі. Помню, як толькі быў атрыманы тэкст даклада, мы адразу ўзяліся за пераклад і па частках здавалі ў набор. А калі прыехалі ў гор. Варонеж Міхась Лынькоў і Кандрат Крапіва, газета ўжо была завёрстана. Яны прачыталі, унеслі некаторыя свае праўкі ў пераклад, і газета пайшла ў друк. Тады толькі мы сабраліся ў свой пакой, прыгадалі свае сем'і (шмат хто з нас не ведаў дзе яны і ці жывыя), дасталі з салдацкіх кайстраў небагатыя спажыткі і ўзнялі па чарцы за Сталіна, за народ і за нашу перамогу.

Немцы тады былі пад самай Масквой. Аднак, той факт, што Іосіф Вісарыёнавіч Сталін знаходзіўся ў непасрэднай блізкасці ад фронту, умацоўваў нашу веру, што немцам не бачыць Масквы, як сваіх вушэй.

Усю ноч з 6-га на 7-е лістапада 1941 года мы працавалі ў друкарні, самі былі перакладчыкамі, карэктарамі, стылістамі. Прыкладна каля адзінаццаці гадзін раніцы адправілі гатовы тыраж газеты на аэрадром. Відаць, нам у той дзень не ўдалося-б заслаць газету за лінію фронту, але дапамог у гэтай справе Н. С. Хрушчоў.

7-га лістапада ў Варонежскім Доме Чырвонай Арміі ў часе абеда мы сустрэліся з рускімі і ўкраінскімі пісьменнікамі. Сярод іх былі: Бажан, Далматоўскі і інш. Усе яны знаходзіліся пад уражаннем даклада таварыша Сталіна. Я заўважыў, што мае сябры зусім перамяніліся, сталі вясёлымі, разгаворлівымі.

Там-жа, у Варонежы, група беларускіх пісьменнікаў пабыла ў украінцаў у гасцях. Алесь Кучар і літработнік газеты Рабіновіч збіраліся ляцець у Маскву па справах рэдакцыі, а мы ўсе паехалі ў Лебядзянь, на сталую базу рэдакцыі газеты «За совецкую Беларусь».

Так было праведзена намі свята Вялікай Кастрычніцкай Соцыялістычнай Рэволюцыі ў 1941 годзе.

Якуб Колас вылучаны ў састаў Рэспубліканскай Камісіі па выбарах у Совет Нацыянальнасцей

31 кастрычніка адбылося пашыранае паседжанне Праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі, прысвечанае вылучэнню кандыдата ў састаў Рэспубліканскай выбарчай камісіі па выбарах у Совет Нацыянальнасцей.

— Удзел у рабоце Рэспубліканскай выбарчай камісіі, — заявіў пісьменнік Міхась Лынькоў, — пачэсная і адказная народная справа. Я прапаную ў састаў камісіі Канстанціна Міхайлавіча Міцкевіча (Якуба Коласа). Мы ведаем Якуба Коласа не толькі, як народнага паэта Беларусі, але і як вялікага грамадскага дзеяча. Ён апраўдае давер'е народа.

Выступіўшыя пісьменнікі і паэты: Пятрусь Броўка, Максім Танк, Пятро Глебка, Ілья Гурскі і Міхась Клімковіч аднадушна падтрымалі кандыдатуру Якуба Коласа.

Паседжанне Праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі аднагалосна рашыла вылучыць К. М. Міцкевіча (Якуба Коласа) кандыдатам у састаў Рэспубліканскай выбарчай камісіі па выбарах у Совет Нацыянальнасцей.

(БЕЛТА).

Ад Совета Народных Камісараў СССР

Совет Народных Камісараў СССР з глыбокім жалем паведамляе аб смерці выдатнейшага майстра совецкага тэатра Народнага артыста СССР, лаўрэата Сталінскай прэміі Нікалая Паўлавіча Хмялёва, які раптоўна памёр у выніку цяжкай хваробы.

ПЯТРО ГЛЕБКА

Збыліся вешчыя словы правадыра

Святочныя дні Кастрычніка — заўсёды незабыўныя даты. Але і паміж іх ёсць найбольш яркія і памятныя. Для мяне такімі з'яўляюцца дні Вялікага Кастрычніка 1942 года. Гэта была дваццаць пятая гадавіна нашай Соцыялістычнай рэволюцыі — чверць стагоддзя нястомнага будавання новага чалавечага свету. Гэта была другая гадавіна Кастрычніка ва ўмовах Вялікай Айчыннай вайны — шаснаццаць з паловай месяцаў зацятай барацьбы з нямецкімі полчышчамі. Мы сустракалі гэтую векапомную гадавіну не дома і не ў кругу сваёй сям'і, але ўжо непадалёку ад роднай Беларусі, на подступах да яе — у адным з пунктаў Калінінскага фронту.

У той час на Калінінскім фронце было нас чатыры беларускія пісьменнікі— Ілья Гурскі, Алесь Кучар, Пімен Панчанка і я. Былі яшчэ мінскія журналісты і гомельскія друкары. Мы выдавалі газету «За свабодную Беларусь» і сатырычны дадатак да яе «Партызанская дубінка». Выданні прызначаліся для насельніцтва часова акупіраваных немцамі беларускіх раёнаў. Да нас у рэдакцыю, прабраўшыся цераз лінію фронта, заходзілі часамі віцебскія партызаны. Яны прыносілі скупыя, але жудасныя весткі пра жыццё нашага народа пад ярмом нямецка-фашысцкіх акупантаў.

Рыхтуючыся да светлага свята Кастрычніка, мы думкамі нашымі былі на радзіме. У гэтыя дні зарадзіліся першыя радкі майго верша, змешчанага ў святочным нумары нашай газеты:

Светлыя вобразы роднай краіны,
Горкая мука і радасць мая!
Сіняе неба і вочы дзяўчыны,
Гомаіць нівы і спеў салаўя...
Я не пазбудуся вас і па смерці,
Кожная рыска на сэрцы ляжыць.
Лёсам мне суджана з вамі памерці,
Нельга без вас сіратою мне жыць.

Праз нашу газету нам хацелася перадаць роднаму беларускаму народу тую няўміручую веру ў перамогу, з якою жыў і працаваў увесь совецкі народ. Нам хацелася расказаць аб той, ніколі нязнанай мужнасці, з якою Чырвоная Армія змагалася пад Ленінградам і на Паўночным Каўказе, на вуліцах Сталінграда і на подступах да Беларусі, — змагалася за вызваленне нашай рэспублікі і за свабоду і незалежнасць усёй нашай вялікай соцыялістычнай бацькаўшчыны. Нам хацелася перадаць заняволеным людзям бацькоўскае слова Сталіна, расказаць аб яго клопатах і думах аб нашым народзе.

Памеры газеты і яе паліграфічная база, якая змяшчалася на двух грузавых машынах, абмяжоўвалі нашы жаданні. Мы эканомілі кожны радок тэксту, але імкнуліся выдаць газету па-святочнаму і ўкладвалі ў падрыхтоўку кастрычніцкіх выданняў усё сваё ўмельства і любасць. У «Партызанскай дубінцы» прынялі ўдзел маскоўскія мастакі Б. Ефімаў, Далгарукаў і Елісееў. Нумар газеты выйшаў багата ілюстраваны, у дзве фарбы, аздоблены каляровымі беларускімі арнаментамі, арыгінальнымі застаўкамі і канцоўкамі. У ім мы расказвалі аб гераічных подвігах сыноў Беларусі на ратных палях і на працоўным фронце. Мы апісвалі жудасныя разбурэнні і гвалт, якія чынілі гітлераўцы на беларускай зямлі. Мы імкнуліся падаць факты так, каб яны самі сабою клікалі да бязлітаснай помсты нямецкім акупантам. У газеце былі змешчаны вершы патрыярха нашай паэзіі, аднаго з самых старэйшых змагароў за долю Беларусі —Янкі Купалы і маладога воіна і паэта, равесніка Кастрычніка Пімена Панчанкі.

Пад вечар шостага лістапада, калі другая палова тыражу нашай газеты яшчэ друкавалася, першая была ўжо адвезена на бліжэйшы палявы аэрадром. Заўтра раніцой, 7 лістапада, чырвонакрылыя самалёты павінны былі пранесці свежыя лісткі праз гарматны агонь фронта, рассыпаць іх над асеннімі палямі Беларусі і зараніць у сэрцы змучаных людзей іскры новай надзеі і веры, якія-б азарылі святочным агнём кожны куток заняволенай зямлі.

Як мы жадалі гэтага шчасця!

Аб гэтым мы думалі моўчкі і гаварылі ўголас, успамінаючы родныя мясціны, прыгадваючы святкаванне Кастрычніка ў былыя мірныя і шчаслівыя годы. Мы сядзелі ў пакоі рэдакцыі каля нашага радыёпрыёмніка, абстаўленага добрымі двума дзесяткамі сухіх электрычных батарэй. Пры кожным яго шолаху мы затойвалі наша дыханне. Мы чакалі пачатку традыцыйнага ўрачыстага паседжання Маскоўскага Совета дэпутатаў працоўных, прысвечанага Кастрычніку. І вось — загаварыла Масква. Выбухнула грымотная навальніца воплескаў — працоўныя Масквы віталі нашага геніяльнага правадыра і палкаводца Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна.

Глыбокі сталінскі аналіз суадносін нашых і варожых сіл у вайне раскрыў перад намі блізкую перспектыву нашай перамогі над ворагам: «Англа-совецка-амерыканская кааліцыя мае ўсе шансы, каб перамагчы італа-германскую кааліцыю, і яна без сумнення пераможа» (Сталін).

Мы слухалі спакойны, упэўнены голас правадыра, удумваліся ў кожнае яго слова, і перад намі ўсё яркэй і яркэй яснелі далі. Мы разумелі, што наперадзе яшчэ мае быць цяжкая і суровая барацьба. І ўсё-ж такі нам здавалася і верылася, што ўжо ў самыя бліжэйшыя дні мы ступім на нашу родную беларускую зямлю.

Пасля даклада мы сабраліся ў памяшканні праўлення калгаса, дзе размяшчаўся наш «наборны цэх». Тут была ўся наша невялікая беларуская сям'я — пісьменнікі, журналісты, наборшчыкі, друкары і іншыя работнікі рэдакцыі і друкарні. Дбайна захоўваючы традыцыі гасціннасці нашай бацькаўшчыны, мы запрасілі і гасцей. Пад бяседныя сталы прыстасавалі наборныя касы і іншую «друкарскую мэблю».

Мы паднялі самы шчыры тост за нашу Радзіму, за наш гераічны народ, за нашага бацьку і правадыра, за генія нашай доблесці і перамогі таварыша Сталіна.

Дзень сёмага лістапада быў у нас працоўным днём: мы перакладалі і набіралі даклад і загад войскам таварыша Сталіна. Мы ведалі, з якою прагаю і надзеяй чакаюць на акупіраванай тэрыторыі мудрага слова правадыра. І праз некалькі дзён і на заняволенай зямлі яно перадавалася ўжо з вуснаў у вусны:

«Недалёка той дзень, калі вораг зведае сілу новых удараў Чырвонай Арміі. Будзе і на нашай вуліцы свята!»

Збыліся вешчыя словы правадыра. Сёння наша радзіма святкуе гадавіну Кастрычніка, азаронная непагасным святлом вялікай Перамогі.

Работнікі совецкай літаратуры і мастацтва! Стварайце творы, вартыя вялікага совецкага народа!

(З заклікаў ЦК ВКП(б)).

* * *

ЛЯ РАБОЧАГА СТАЛА ПІСЬМЕННІКА

Міхась Лынькоў

ПЛАНЫ НА БУДУЧАЕ

Калі гаварыць аб уласнай творчай працы за годы вайны, дык за гэты час зроблена надзвычай мала: мною выдадзены толькі адзін зборнік апавяданняў «Астап». Увесь астатні час быў аддадзены франтавому друку— у першыя годы вайны — і публіцыстычнай працы. Выступаць з артыкуламі даводзілася вельмі часта. Усе гэтыя выступленні былі прысвечаны нашай роднай Беларусі, якая знаходзілася ў той час пад акупацыяй гітлераўскіх драпежнікаў. Гэтыя артыкулы змяшчаліся ў нашай цэнтральнай прэсе, у франтавых газетах, у выданнях славянскіх краін і ў розных іншых газетах замежжа. Хацелася, каб усюды ведалі аб нашай краіне, каб усюды чулі аб не слаўным народзе, аб яго гераічнай барацьбе з праклятымі захопнікамі. Зразумела, што гэтыя артыкулы не маглі і не могуць замяніць мастацкіх твораў аб нашай радзіме і аб нашым народзе.

Наша беларуская літаратура адчувае вострую патрэбу ў добрай мастацкай прозе. Рады нашых празаікаў за апошнія годы значна парадзелі. Мы панеслі незваротныя страты: сярод нас няма нашых карыфеяў мастацкага слова— Бядулі, Кузьмы Чорнага, Самуйлёнка. Загінулі ў барацьбе з ворагам Мурашка, Шынклер. Задача выхавання маладых кадраў празаікаў надзвычай складаная і адказная, і гэтай задачы мы павінны аддаваць сур'ёзную і вялікую ўвагу. А кожны з празаікаў павінен працаваць так, каб як мага задаволіць узросшыя запатрабаванні ў добрай мастацкай кнізе.

Гаварыць аб сваіх творчых планах на будучае даволі цяжка, бо наогул непрыемна гаварыць аб тых кнігах, якіх яшчэ няма, якія не напісаны. Зроблена мной і не апублікавана яшчэ кніжка нарысаў аб удзельніках вызвалення нашай радзімы ад фашысцкіх захопнікаў. Цяпер пішу кніжку пра свае ўражанні ад падарожжа ў Амерыку. Але асноўная праца — гэта праца над раманам аб партызанскай барацьбе нашага народа. Раман пачаў пісаць гады паўтары таму назад, і яму аддаю я ўвесь свой час, які застаецца ад працы ў Саюзе пісьменнікаў і ў Акадэміі Навук.

Хацелася-б яшчэ напісаць кніжку апавяданняў і другую частку кнігі для дзяцей «Міколка-паравоз».

Такія мае планы на будучае.

Міхась ЛЫНЬКОЎ.

БАРАНАВІЦКІ ТЭАТР

Баранавіцкі Абласны Драматычны тэатр распачаў работу ў новым сезоне 1945—46 г.

Тэатр працуе над праграмай да Кастрычніцкага свята, у якую ўваходзяць музыкальныя, вакальныя і харэаграфічныя нумары. Есць спецыяльная праграма да кампаніі выбараў у Вярхоўны Совет. Пішуцца прыпеўкі на мясцовую тэму.

На ўсесаюзны агляд рускай класікі вызначана п'еса А. Астроўскага «Даходнае месца».

Рэпертуар тэатра складаецца з наступных п'ес: «Мілы чалавек» К. Крапівы, «Місія містэра Перкінса ў краіну большэвікоў» А. Карнейчука, «Іспанцы» Лермантава (рэжысёр Я. Танальскі), «Як гартавалася сталь» Астроўскага (рэжысёр А. Нячаеў), п'есы на тэму вайны і для дзяцей.

Калектыў тэатра папоўніўся новымі творчымі работнікамі.

У сувязі з адсутнасцю тэатральнага будынка ў абласным цэнтры тэатр пераводзіцца ў раённы горад Слонім.

Новая опера Д. Лукаса

Кампазітар Д. Лукас да 28 гадавіны Кастрычніка заканчвае працу над операй «Кастусь Каліноўскі» (лібрэта М. Клімковіча). Першы і чацверты акты оперы ўжо былі праслуханы музыкальнай грамадскасцю сталіцы. Тэатр оперы і балета намеціў выпусціць спектакль «Кастусь Каліноўскі» ў першай палове 1946 года.

Мастакі-самавучкі

Да рэспубліканскага конкурса работ мастакоў віцебскія мастакі-самавучкі падрыхтавалі наступныя экспанаты: «Тав. Панамарэнка сярод беларускіх партызан», «Партызаны ў разведцы», «Уваход Чырвонай Арміі ў Віцебск» і «Зверствы немцаў у Віцебску» (Дамінскі); скульптуры «Маці партызанка» (Дамінскі) і «Перамога» (Лушчына).

* * *

У дні свята 1943 года

У двух кілометрах ад вёскі Пярэспа — дрымучы лес. Людзі кажуць, што гэты лес не мае канца, такі ён вялікі. Густыя, спрадвечныя яліны, амаль непраходны гушчар надзейна ахоўваюць партызанскія зямлянкі брыгады Розава і Канановіча. Мы, звыклыя лясныя жыхары, і то часта не адразу трапляем у сваю зямлянку.

Заўтра свята — дзень 26 гадавіны Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі.

Сёння ўночы і заўтра раніцой будуць вяртацца з баявых заданняў галоўныя сілы партызан. Дыверсійная група лепшага падрыўніка і самадзейнага мастака Бяляева ўжо трэці дзень вартуе нямецкія эшалоны на магістралі Лунінец-Калінкавічы. Бацька Гальчэня, сувязны штаба злучэння, каторы дзень з аўтаматам у руках і з паляўнічай торбай перад сабой перакрыжоўвае «партызанскі асфальт» — балота. Яму няма ні дня, ні ночы. Ен усюды паспявае занесці загады і распараджэнні генерал-маёра Казлова і прыняць весткі аб прадсвяточнай рабоце атрадаў і брыгад. Яго рыжаватыя вусы і барада мігцяць то тут, то там. Яму няма і змогі, хоць пераваліла за пяцьдзесят год. І дзе-б ён ні быў і што-б ні рабіў, заўсёды ён мармыча любімую песню «Трансваль».

Пяць гадзін вечара. Паміж разгатых ялін невялікі столік з дошчак. Каля стала ўзбоч карта Совецкага Саюза. На ёй радысты штодзённа ставяць чырвоныя сцяжкі, якія сведчаць аб прасоўванні Чырвонай Арміі на захад. Хутка будзе мітынг лясных салдат. Недзе ўверсе ззяюць яшчэ сонечныя праменні. З-за дрэў прабіваюцца лапіны сіняга-сіняга неба.

Хоць ужо больш за тры месяцы, як я прыбыў да партызан з «вялікай зямлі», але тут я самы свежы чалавек з самымі цікавымі навінамі.

Толькі паспеў расказаць аб Кастрычніцкім свяце і перайшоў да чыткі сваіх вершаў, напісаных у нямецкім тылу, як абвясціў радыёпрыёмнік загад таварыша Сталіна аб узяцці нашымі войскамі сталіцы Украіны—Кіева. Стрымліваючы галасы (ад нас не так ужо далёка нямецкі гарнізон), шэптам мы пракрычалі «ура» і асцярожна прапляскалі ў далоні. Усё-такі лес і рэха, а вецер не на нашу карысць. Пасля, забыўшы на асцярогу, шумна віталі мы адзін аднаго з перамогай. Партызан-украінцаў хапілі на рукі партызаны-беларусы і доўга іх гушкалі ў паветры.

Змерклася. У лесе ціха, як у пустой хаце. Камандаванне брыгады выехала ў атрады, хто на баявыя аперацыі, хто на мітынгі партызан і мясцовага насельніцтва. У радыё-зямлянцы поўна народу. Праз некалькі хвілін у Маскве з дакладам аб 26 гадавіне Вялікага Кастрычніка выступіць таварыш Сталін.

Між лесу, на мшыстай палянцы,
Як гоман асеў баравы,
Сышліся мы ў цеснай зямлянцы,
Каб голас паслухаць Масквы.
Зямлю грэе сонца ўжо скупа.
З асін асыпаецца ліст.
Праверыў і хвалю і рупар
Нязменна вясёлы радыст.
Вось грымнулі воплескі громам.
Зямлянка, зямлянка, зважай!
І голас, як сонца, знаёмы
Пачуў беларускі наш край.
У нас прасвятліліся вочы,
І стала ў зямлянцы цяплей,
І кожны наблізіцца хоча
Да рупара трошкі бліжэй.
Усім нам здалося, што Сталін
Гаворыць са мной і з табой.
І мы падняліся, мы ўсталі,
Каб рынуць на ворага ў бой.

Мы слухалі Сталіна! Гэта была непередаваемая радасць. Бацька Гальчэня, які падаспеў на гэты час, крадкам выцер шчаслівую слязу і ўсміхнуўся. «Вось як!» — сказаў ён сабе і так-жа непрыкметна выйшаў з зямлянкі, як і ўвайшоў. Мы разыходзіліся па сваіх буданах шчаслівыя і здаволеныя.

10 гадзін вечара, перад святам. Я адзін у зямлянцы. У бляшанцы, напоўненай лоем, ледзь патрэсквае кнот. Блукаюць цені па асовых плашках столі. На сэрцы нейкі лёгкі сум. Недзе далёка, у Маскве сабраліся ўжо мае таварышы па працы за святочны стол. Ярка палае электрычнасць. Па вуліцах трубяць тысячы сірэн аўтамашын. А я ў гэты час сяджу адзін у лясной зямлянцы. Хочацца курыць, а тытуню і на панюшку няма. І міжволі кладзецца на паперу верш, радок за радком.

Танцуе агонь у бляшанцы
І вецер бубніць у страху.
І мне ў партызанскай зямлянцы
Становіцца сумна крыху.
Бо сёння таварышы недзе
Сядзяць за спакойным сталом
І дружбу ў вясёлай бяседзе
Мацуюць святочным віном.
А покуль агонь у бляшанцы
Танцуе, і вецер гудзе,
І мне ў партызанскай зямлянцы
Магчыма і сумна ледзь-ледзь.

Верш не даў мне дапісаць Васіль, памочнік камандзіра атрада Кудашова. Ен родам сам з-пад Кіева. Як ён заскакаў па зямлянцы, калі я паведаміў яму пра Кіеў.

— Як ведаў, як чула маё сэрца, — закружыўся навокал мяне Васіль. — Бач, якая біклажка першаку! За наш Кіеў, за Украіну! — і я не паспеў агледзецца, як у маіх руках апынулася шклянка пярэспінскай гарэлкі. Толькі мы чокнуліся, як расчыніліся дзверы, і ўвайшлі камандзір брыгады Смірноў і камісар Канановіч. Канановіч паклаў перада мной пробны экземпляр маёй кніжкі вершаў «Слуцкі пояс», выдання падпольнай слуцкай газеты «Народны мсцівец». «Як? — спытаў ён. — Афармляў Саша Бяляеў і Саша Залаты. Ці добра? Гэта яны-ж сёння «афармілі» чатыры нямецкія эшалоны пад адкос». Я паціснуў руку Канановічу, і мы пацалаваліся.

Гутарылі мы аб усім і доўга, седзячы за партызанскім прадсвяточным сталом. Хвоі яліны белымі лапамі пастукалі нам у адзінае замаскаванае вакенца, калі мы збіраліся адпачываць. Але то былі не хвоі, а ўмоўны знак вартавога ў часе трывогі. Паспаць так і не давялося. Патрэбна было абараняць спакой партызанскай зямлі.

7 лістапада 1943 года я трапіў у брыгаду Шубы, акурат на паседжанне штаба. Немцы палезлі ў партызанскую вёску Макарычы за здабычай. Трэба правучыць. А ў лесе тымчасам адбываўся парад партызанскіх войск. Сакратар Стара-Дарожскага падпольнага райкома КП(б)Б тав. Траскуноў зачытвае кастрычніцкі загад Галоўнакамандуючага Совецкага Саюза таварыша Сталіна. Як-бы ў адказ на гэты загад камбрыг тав. Шуба аддае распараджэнне аб выступленні сваіх атрадаў на падтрымку вёскі Макарычы. І ні ўкога на твары ні скаргі, ні смутку, што не давялося спакойна адсвяткаваць Вялікі Кастрычнік.

Бо мы Макарыч не саступім,
Паўзводна выступім з прасек
І так грабежнікаў адлупім,
Каб памяталі нас вавек.
А што мы трохі не даелі.
І не хапіла крышку сна, —
Натое ў шэрым мы шынелі,
Натое зараз і вайна.
А вось закончым бой суровы,
Спаўна чужынцам аддадзім
І з партызанскай прыдзем славай,—
Тады даспім і даядзім.

Анатоль АСТРЭЙКА.

„ЗА ЛІНІЯЙ КЕРЗАНА"

Свята — гадавіна Кастрычніцкай рэволюцыі — гэта не проста свята, калі людзі адпачываюць.

Гадавіна Вялікай Кастрычніцкай Соцыялістычнай Рэволюцыі — гэта дзень пачатку новай эры для ўсяго чалавецтва. Гэта—перамога ідэі Леніна—Сталіна.

Я мог-бы расказаць, як святкаваўся «Кастрычнік» у турмах панскай Польшчы, калі з-за крат кідаліся лозунгі, калі хлопцы ішлі на прагулцы «ў ногу», з чырвонымі значкамі на грудзях, калі на ўсю турму грымеў «Інтэрнацыянал», калі ва ўсіх быў настрой да штурму, настрой шчасця—быць у радах барацьбітоў за новы лепшы лад для народа, як цярпелі рэпрэсіі за гэта і г. д. Але ўсё гэта адшумела, адыйшло далёка. На парадку дня штодзённая суровая праца — праца па правядзенню ў жыццё вялікіх прынцыпаў Кастрычніцкай Рэволюцыі і замацаванню іх у эканоміцы, палітыцы, у свядомасці людзей.

Дзень Кастрычніцкай рэволюцыі ў 1944 годзе застаў мяне ў групе з другімі таварышамі аж у Бельскім раёне, за Беластокам, куды мы па камандыроўцы тав. Панамарэнкі ездзілі за «лінію Керзана», дапамагчы беларусам, якія жадалі перасяліцца ў нашу рэспубліку.

Нашай групе, на чале з т. Зімяніным, далі для работы Арлянскую воласць. Прыехаўшы ў мястэчка Орлю, мы засталі там адну нашу вайсковую часць.

Назаўтра зрабілі туды візіт. Начальнік часці — малады лейтэнант прыняў нас вельмі ветліва, цёпла. Седзячы каля стала, ён з належнай увагай выслухоўваў нашы просьбы. Мы прасілі некалькі агітатараў у дапамогу для работы па сёлах. Просьба наша была задаволена. І тут-жа, непасрэдна па сканчэнні гутаркі, лейтэнант запрасіў нас на святкаванне Кастрычніцкай рэволюцыі.

Назаўтра мы прышлі ў часць у рабочым настроі — прышлі паслухаць весткі з франтоў і загад таварыша Сталіна. Камісар часці зрабіў нам даклад, пазнаёміў з сталінскім загадам.

Мы падзякавалі камісару, таксама прывіталі яго са святам і пачалі развітвацца. Аднак, лейтэнант затрымаў нас і павёў у другі пакой. Там быў накрыты стол.

Выпілі здравіцу за нашу Чырвоную Армію, што здабыла сабе неўміручую славу, за вялікія прынцыпы Кастрычніцкай рэволюцыі,—за прынцыпы Леніна—Сталіна, за Вярхоўнага Галоўнакамандуючага таварыша Сталіна, за вялікі народ.

На дварэ падаў снег і пакрываў імглою навакольныя палі.

На другі дзень мы разыйшліся па сёлах для правядзення сходаў.

Піліп ПЕСТРАК.

Пераможны Кастрычнік

28 гадавіна Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі — 2-я гадавіна, якую я сустракаю на беларускай зямлі пасля вызвалення нашай роднай Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У суровыя годы вайны, далёка ад свайго народа, беларускія кампазітары не страцілі сваёй духоўнай блізкасці з народам і працавалі на карысць нашага роднага беларускага мастацтва. Прайшло больш года, як мы працуем і жывем у родным Мінску. Гэты год быў годам вялікага творчага ўздыму. Нягледзячы на цяжкасці аднаўлення, за гэты год беларускімі кампазітарамі быў напісан рад буйных і дробных твораў. Я асабіста закончыў оперу «Надзея Дурава» ў клавіры, напісаў сімфанічную паэму, 2 хоры на словы Багдановіча «Слуцкія ткачыхі» і «Ноч», рад апрацовак для хора народных песень, раманс на словы Пестрака «Павей, вецер» для голаса з аркестрам. Роднае паветра дае мне новыя сілы для плённай працы. Маімі бліжэйшымі планамі з'яўляюцца напісанне сімфоніі і праца над операй, у якой я хачу адлюстраваць Полацкую Русь.

Усе кампазітары цяпер падрыхтоўваюцца да пленума, які адбудзецца ў 1-й палове 1946 года. 28 гадавіну я сустракаю з вялікім творчым уздымам і светлымі пачуццямі, і смела гляджу ў будучае.

А. БАГАТЫРОЎ.

Нашы прыйшлі. Карціна мастака Я. Ціхановіча.

Е. МІРОВІЧ

КАСТУСЬ КАЛІНОЎСКІ

(Урывак з п'есы)

Дзея 4-я, карціна 1-я.

Двор Святаянскага кляштара ў Вільні. З левага боку ўваход у касцёл, далей брама на вуліцу і будынак, дзе на другім паверсе часова жыве Каліноўскі пад прозвішчам Вітольд Вітожэнц.

(Вечар. Чуваць касцёльны звон; у браму ўваходзяць парафіяне, ідуць да касцёлу, з двара ідзе ксёндз, за ім нагляднік дому).

Ксёндз. Памятайце, дамавыя кніжкі павінны быць у парадку. Усіх прыезджых неадкладна запісваць. Мы з вамі за гэта адказваем.

Нагляднік дому. Не турбуйцеся, ойча духоўны. Усё зроблена як трэба. А чаму так позна правіце набажэнства?

Ксёндз. (уздыхнуўшы). Загад Мураўёва. Нічога не зробіш. (Ідзе да касцёлу. Уваходзіць кватарант).

Кватарант. А, пан нагляднік, вечар добры. Ну, як у вас, усё спакойна?

Нагляднік дому. А хіба не чулі ў горадзе?

Кватарант. А што?.. Я толькі прыехаў.

Нагляднік дому. Замах быў на нашага маршалка шляхты Дамейку.

Кватарант. Забілі?

Нагляднік дому. Паранілі... на яго кватэры.

Кватарант. Злавілі?

Нагляднік дому. На вакзале злавілі, хацеў уцячы.

Кватарант. А хто?

Нагляднік дому. Невядома. Праз гэты врышт спадзяюцца і Каліноўскага злавіць.

Кватарант. Не выдасць. Маўчаць будзе.

Нагляднік дому. У Мураўёва загаворыш. Вы куды, да касцёлу?

Кватарант. Не. да дому, адпачыць з дарогі. (Уваходзіць у дом).

Нагляднік дому. Мне трэба запісаць вас у кнігу, а то, ведаеце, так строга... Калі што і на Лукішкі (выходзіць).

(У браму ўваходзяць Старжынская і Каліноўскі).

Старжынская. Раджу табе быць асцярожным, забойцу Дамейкі злавілі, баюся, каб не выдаў цябе, што жывеш пад прозвішчам Вітожэнца..

Каліноўскі. Не хвалюйся. Праз гадзіну мяне тут не будзе. Мураўёў святкуе перамогу, але мы яшчэ паглядзім... Не ўсё яшчэ страчана... Заўтра спаткаемся, Грыпіначка, ля трох крыжоў... Прыходзь а пяцай гадзіне...

Старжынская. Добра (абдымае яго). Беражы сябе... (ён цалуе яе). Бывай! (Яна выходзіць у браму).

(У касцёле чуваць гукі аргана).

Каліноўскі (прыслухоўваючыся). Моляцца... Узносяць малітвы найвышэйшаму прастолу аб спакоі на зямлі. І народ верыць, верыць!..

(Ідзе па сходах на другі паверх, нагляднік а дзвярэй).

Нагляднік дому. Выбачайце, пане, у якім нумары вы жывеце?

Каліноўскі. У дзевятым.

Нагляднік дому. А як ваша прозвішча?

Каліноўскі. Сёння вы ўжо трэці раз пытаеце мяне! (Пайшоў).

Нагляднік дому. Выбачайце, але цяпер такія строгасці... Калі што—будзьце ласкавы на Лукішкі... (пайшоў да сябе).

(Убягае старая).

Старая. Езус Хрыстус! Ай, матка боска!.. Ой... Пан нагляднік. Войска з усіх бакоў абыходзіць наш квартал.

Нагляднік дому. Ізноў аблава, я

Е. Міровіч

прадчуваў гэта; учора дамавыя кнігі праглядалі... ой, пайду зраблю парадак.

(Абодвы выбягаюць).

(Уваходзяць афіцэр і паліцмайстар).

Паліцмайстар. Я маю пэўныя весткі, хто хаваецца тут пад прозвішчам Вітольд Вітожэнц; хаця па кнігах такога не значыцца, але ў тэлеграме палкоўніка Лосева ясна сказана: «Каліноўскі хаваецца ў Святаянскіх мурах пад прозвішчам Вітольд Вітожэнц». Прывядзіце сюды частку салдат, рэшта няхай застаецца на месцах і сочыць за вокнамі і ўваходамі. Кожнага, хто ўваходзіць, затрымліваць.

Афіцэр. Слухаю, пан палкоўнік.

(Арган іграе).

Што гэта?

Паліцмайстар. Моляцца... Гэта загад Мураўёва.. вось не ў пару... Гэта робіць больш складанай нашу справу. Трэба паставіць ля ўвахода ў касцёл двух вартавых і нікога не выпускаць. Вядзіце, паручык, салдат. (Паручык выходзіць. У часе размовы ў вароты ідзе Старжынская; пры праходзе паручыка стала ў цень, потым выходзіць).

Паліцмайстар. Эх, злавіць-бы яго, галубочка. На прыкмеце ў Мураўёва буду.

(Аглядае дом, убачыўшы Старжынскую, схаваўся).

Старжынская. Ледзве прайшла праз ланцуг войска. Яго зараз зловяць, трэба ратаваць.

(Ідзе на сходы, паліцмайстар хапае яе).

Паліцмайстар. Куды, мадмуазель, спяшаецеся?

Старжынская. Да сябе дамоў.

Паліцмайстар. Дазвольце, я праводжу вас. (Бярэ яе за руку).

Старжынская. Пакіньце.

(Вырываецца).

Паліцмайстар. Э, э, паненка. Ціха! Дзе кватаруеце?

Старжынская. Я выпадкова сюды зайшла.

Паліцмайстар. Выпадкова? А сказалі «дамоў». Вы арыштаваны.

(Уваходзіць афіцэр, за ім салдаты).

Афіцэр. Не грукаць. Ціха. Стой!

Паліцмайстар. Ціха!

(Старжынская бяжыць у браму, за ей паліцмайстар з крыкам). Не выпускай, трымай яе!

(Афіцэр злавіў яе ля брамы).

Арыштаваць! Мабыць птушка стрэляная. Паручык, дваіх да касцёлу і нікога не выпускаць. (Ставяць вартавых). Іншыя пад сходы сюды, па свістку да мяне — у момант. Ну-с, паручык.. Тсс!..

(Выходзіць нагляднік).

Хто такі?

Нагляднік дому. Нагляднік дому.

Паліцмайстар. У вас учора прыстаў па кнігах шукаў Вітольда Вітожэнца і не знайшоў, а ў мяне ёсць весткі, што ён тут кватаруе.

Нагляднік дому. Калі шукалі па кнігах і не знайшлі, відаць няма такога.

Паліцмайстар. А калі я знайду?.. Паказвайце падазроныя кватэры.

Нагляднік дому.. У нас няма такіх.

Паліцмайстар. Убачым! Паручык, пачнем з першага паверху, і вы з намі.

(Выходзяць. Засталіся ля касцёла два салдаты на варце).

(Чуваць у касцёле гукі аргана).

Малады салдат. Ловяць каго?

Стары салдат. Казалі, самага галоўнага іхнага правадыра. У Мінску яго аднойчы злавілі, дык ўцёк.

Малады салдат. Спрытны!

Стары салдат. Ды яны ўсе спрытныя.

Малады салдат. А там, чуеш, моляцца: хе-хе, смешная ў іх вера, музыка іграе...

Стары салдат. Кожны па-свойму богу моліцца... Вось таксама ёсць гэткія, што праз агонь скачуць — скакуны празываюцца, а ёсць, што бізуном сябе сцябаюць, дык тыя хлестуны...

Малады салдат. А якому богу яны моляцца, нашаму?

Стары салдат. Дураны! Будзе наш бог важдацца з імі. Кожны свайму моліцца.

Малады салдат. Дык, відаць, багоў многа?

Стары салдат. Дурны ты...

Малады салдат. Чаму дурны? Ды бог адзін?

Стары салдат. Адзін!

Малады салдат. А калі кожная вера моліцца свайму, дык, бач, колькі выходзіць багоў.

Стары салдат. І зноў-жа ты дурань. Гэта яны думаюць, а іх багі не сапраўдныя. Гэта наш толькі сапраўдны.

Малады салдат. Ага! Дык, тады, яны моляцца ўпустую.

Стары салдат. Упустую, вядома.

Малады салдат. Вось дзівакі, дармз час трацяць.

Стары салдат. Дарма. А ў смалу пападуць да чарцей.

Малады салдат. А мы куды пападзем?

Стары салдат. Мы?.. нам месца вызначана ў райскі сад, таму мы хрысталюбівае воінства, ідзем за цара, памазаніка божага, вось усякую нечысць ловім.

Малады салдат. А за што іх ловім?

Стары салдат. А во! (паказвае пракламацыю). Цыдулькі раскідваюць!.. пра цара...

Малады салдат. Пра цара?

Стары салдат. Ага!..

Малады салдат. А ну, пакажы. (Чытае па складох) «Му-жы-цка-я праўда» Мужыцкая?.. Гм. А ў мяне якая. (Лезе рукой за халяву).

Стары салдат. У цябе таксама ёсць?

Малады салдат. У казарме знайшоў, на цыгарку ўзяў во... (паказвае). Таксама «Мужыцкая праўда»... Глядзі ты... За мужыцкую праўду чалавека ловяць. Дзіўна...

Стары салдат. А што там прапісана, непісьменны я.

Малады салдат. Ды і я не дужа...

(Выходзяць: афіцэр, нагляднік і паліцмайстар).

Паліцмайстар. Пакуль няма... Гм... а ну — пойдзем туды.

(Паказвае на гару, у вакне запалілі агонь).

Выходзіць хтосьці. Хлопцы, не дыхай! (Хаваюцца).

(Каліноўскі са свечкай паказваецца ў дзвярах і сходзіць па сходах з чамаданам).

Паліцмайстар (выскачыў з рэвальверам). Ваша прозвішча?

Каліноўскі. Вітольд Вітожэнц.

Паліцмайстар (свішча, салдаты выскакваюць і абкружаюць). Арыштаваць.

Каліноўскі. У чым справа?

Паліцмайстар. Выбачце за непакойства, «пан Каліноўскі».

Каліноўскі. Што? (Пауза, тушыць свечку). Гэта непаразуменне.

Паліцмайстар. Разбярэм... Надзець наручнікі...

(Салдаты надзяваюць ланцугі).

ЗАСЛОНА.

АЛЕСЬ КУЧАР

ПІМЕН ПАНЧАНКА

Пімен Панчанка, як паэт, толькі цяпер увайшоў у пару свае сталасці. Гэта не азначае, што раней не былі прыкметны здольнасці паэта. Яны былі відаць яшчэ ў тым невялікім вершы пра два сонцы, што адлюстраваліся ў вёдрах з вадой, напісаным у 1937 годзе. Але там невыразны быў характар паэта. Цяпер выявілася свая адменная манера пісьма, свой голас. І кожны, хто ўважліва прыглядаецца да творчасці Панчанкі, заўважае, што гэта голас вялікага хараства і сілы.

Што нас радуе ў апошніх вершах Панчанкі — гэта свабодная паставa паэта. Паэт выяўляецца ў гэтых вершах, як вясёлы вандроўнік, якому суджана перамерыць зямлю ўздоўж і ўпоперак. Ці азначае гэта, што ён не прыкуты жаданымі ланцугамі да аднаго кутка — да свае радзімы? Наадварот. Цікавасць да неабдымных прастораў зямлі не памяншае яго тугі па Беларусі. Ды і вандруе ён, як дбайны сын Беларусі, які не на жарты наважыўся «зрабіць яе самай багатай і самай прыгожай».

Гэта вясёлы і адначасна разумны вандроўнік. У адрозненне ад людзей нацыянальна абмежаваных, ён многаму вучыцца ў другіх народаў і што-ні-што з іх багацьцяў здабыў-бы для свае Беларусі, але ён, з другога боку, шчодра гатовы падзяліцца з другімі народамі і багацьцямі свае краіны. У гэтым сэнсе вельмі характэрным з'яўляецца выдатны верш «Што я думаў, гледзячы на Каспійскае мора». Верш цікавы — бо мае шмат адценняў, як і пачуцці паэта — чалавека вялікай душы.

Па-першае, нас зацікаўлівае сур'ёзны намер паэта-грамадзяніна зрабіць сваю краіну «самай прыгожай і багатай».

Выходзячы з гэтай задумы, Панчанка ў гумарыстычных радках выказвае сваю «крыўду»:

І хто гэта часам наіўна гавора,
Што ёсць справядлівасць?
Ад крыўды — аж горача.
Адным вось такое раскошнае мора,
Другія-ж не маюць мізэрнага
морачка.

Для таго, каб даць заключныя чатыры радкі аб намеры паэта зрабіць Беларусь «і самай багатай і самай прыгожай», пісьменнік гіранічна гаворыць аб сваёй «прагнасці»:

Я прагны.
Свой грэх разумею і каюся
І эноўку грашу, яшчэ болей, вядома.
Калі мне цудоўнае што
сустракаецца —
Жадаю загрэбсці і везці дадому.

Але паэт падкрэслівае, што гэта толькі жарт. Душа яго не мае і кроплі нацыяналістычнай прагнасці. Ён ахвотна падзеліцца з другімі народамі ўсім тым, чым багата беларуская зямля:

І ўсё-ж, хто са мною знаёмы,
Той шчыра прызнае, што хлопец я
свой.

Жартоўны тон і тут не пакідае Панчанку:

Дзяволіў ахвотна я нашаму Нёману
Літоўскія землі ўпрыгожыць сабой.
Дняпро на Украіну пусціў я з
Палесся —
Вада у Дняпры з беларускай
крыніцы.
Няхай. Мне не шкода,
Бо гэтулькі песень —
Куды без Дняпра іх падзець
украінцам!

Каб яшчэ болей падкрэсліць, што гэта жарт, які ўзнік з рэальнай мары зрабіць багатай і прыгожай сваю Беларусь, паэт-летуценнік дае дзіўны праект «перадыслакацыі» паловы Каспійскага мора ў Беларусь:

Сягоння, як зоры на небе засвецяцца,
І месяц з-за хмары нахмуранай
выблісне —
Каўшом серабрыстым Вялікай
Мядзведзіцы
Паўмора зачэрпну і ў Піншчыну
— выплесну.

Пасля гэтай страфы становіцца ясна, што мы маем справу не проста з добрым апавядальнікам, які нам расказвае дасціпную гісторыю, а з паэтам-летуценнікам, з якім дружыць уся неабдымная прырода, якому лёгка ў марах здзейсніць любы свой намер.

Асаблівасцю Пімена Панчанкі, як паэта, з'яўляецца нястомны пошук новага, няспынны творчы рост, які відаць з кожнага наступнага верша. Паэт часта памыляецца — збіваецца на чужую, неўласцівую яму манеру пісьма, ці ўпадае ў абстрактнасць, агульшчыну, але вельмі хутка ад гэтага пазбаўляецца і ідзе далей наперад.

Даўно хтосьці сказаў, што добрымі з'яўляюцца ўсе жанры, апрача сумнага. Можна знайсці тыя або іншыя хібы ў паэзіі Панчанкі, але адна бясспрэчная ў яе перавага — яна не сумная. У нас, на Беларусі, ёсць паэты, якія ўладаюць значным талентам паэтычнага ўяўлення, даюць смелыя вобразы, але сюжэт іх твораў да таго аднастайны, кампазіцыя да таго нясталая, што чытаць іх вельмі сумна. У другіх-жа — апісанне прыгод, звязаных са знікненнем якіх-небудзь двух кароў, расцягваецца на цэлую паэму.

Сіла Панчанкі ў тым, што творы яго, пры глыбокім змесце, — лаканічныя, вострыя ў думцы і вобразе і заўсёды, ці ў добрай навеле, ці драматычным творы, маюць нечаканы канчатак. Тут Панчанка многаму навучыўся ад выдатнага майстра нечаканай канцоўкі ў вершы — Генрыха Гейнэ.

У Панчанкі пільнае вока — ён умее бачыць нікім незаўважанае і ў яркай сціслай форме расказаць аб гэтым чытачу.

Калі мы возьмем некалькі выпадковых выпісак з розных вершаў, дык убачым уменне паэта аперыраваць яркім вобразам. У вершы, прысвечаным Максіму Танку, ён піша:

Клічам мы сябе юнакамі,
А цяжкія лічбы гадоў
Пераспелымі жалудамі
Ападаюць са стукам на дол.

А вось яркія і адменныя вобразы з другога твора.

На Ардабільскім перавале,
Пад дзікім позіркам арлоў,
Мяне, як скрыпку, пілавалі
Смыкі дванаццаці вятроў.

Але гэта ўменне арыгінальна бачыць свет стасуецца не да адных вобразаў, а і задумы ўсяго твора, выбара сюжэта. У якасці прыклада можна прыгадаць верш «Мая геаграфія», у якім паэт, з пункту гледжання барацьбы беларускага народа, дае новую і дасціпную геаграфію свае краіны. І тут нас цешыць смеласць і навізна вобразаў:

А ў Прыпяці вусны пяшчаныя
трэснулі
Ад смагі.
І просіць вады непрасоленай
Яна галасамі засмяглымі кнігавак.

Гэтае пільнае і разумнае вока ў спалучэнні з яснай палітычнай акрэсленасцю ідэалаў і дапамагло Панчанку стварыць рад выдатных твораў аб вялікіх днях Айчыннай вайны. Гэта такія вершы, як «Вока снайпера», «Учора тут жылі салдаты», «Адплывае на захад гарматны гром», «Герой», «Лётчыкам «Нарманды».

Якім паўстае перад намі з гэтых твораў сам паэт?

Вось ён ляжыць на пярэднім краі, як снайпер. Яго добрае вока адкрыта «для птушак, дрэў, сяброў і зор высокіх», і толькі чорная цень фрыца засцілае гэтае вока агнём нянавісці.

Вось ён ляжыць каля дротавай загароды ворага. Слабымі грудзьмі ён кладзецца на дрот, каб па яго целе прайшлі ў наступленне дзвесце яго таварышоў. Не ён, а другія пайшлі ў атаку:

А ён свае косці з іржавых
калючак
Сваімі рукамі без стогну аддзёр.
Зваліўся на травы, і стала балюча
І травам, і росам, і ветрам гаючым,
Што прыляцелі з Валдайскіх азёр.

Так мог зрабіць толькі юнак сталінскай эпохі: смелы, праўдзівы, разумны. Такі ён і ёсць у вершы. Гэты камандзір не сентыментальнічае з байцамі, не называе іх «брацішкамі». Перад тым, як пайсці на геройскі ўчынак, ён даволі сурова і саркастычна гаворыць сваім сябрам:

...Уставай, пяхота!
Мы не на пляжы, а на вайне.

І лёг на змяіную скруткі дроту...

Вось ён, гэты юнак, урываецца ў нямецкі бліндаж. Яму ненавісна тут усё: і бутэлькі з віном, і пачкі кепскіх сігарэт, і фота голых прастытутак на сценах.

Яшчэ адна рыса выяўляецца ў вершы «Лётчыкам «Нарманды». Гэта шырокая, можна сказаць, «дружбацкая» натура паэта ў дачыненні да людзей другіх нацый, адсутнасць рысаў нацыянальнай абмежаванасці. Недарма паэт гаворыць у вершы «Лётчыкам «Нарманды»:

Я прайду лясы, палі і горы,
На ўсе краіны пагляджу
І, відаць, за нейкі братні горад
Галаву ад радасці злажу.

У вершы адчуваецца вялікі боль за распятую Францыю і за яе народ.

Здрадзілі. Прадалі. Палажылі
Самую прыгожую пад танк.

І цвёрды заклік:

Іменем рэспублікі — жалезам
Па нахабных мордах смела бі.

Гэты разумны юнак ясна ўсведамляе, што вайна пакіне цяжкую спадчыну ў душах людзей, што яна не можа не пакласці адбітка на сэрцы:

Попел скрыпне ізноў на маіх зубах.
Нашай будучыні гады
Будуць доўга глытаць папялішчаў пах.

Такі воблік барацьбіта паўстае з вершаў Панчанкі аб Айчыннай вайне.

Значную колькасць вершаў прысвяціў Пімен Панчанка Беларусі. Заўсёды паэт знаходзіў самыя прачулыя словы, калі гаварыў пра Беларусь. Тут нельга не прыгадаць верш «Дарагая мая Беларусь». Але калі там мы мелі вельмі шчырую, але крыху сентыментальную рыторыку, дык цяпер ёсць больш глыбокае вырашэнне гэтай тэмы.

З Панчанкам здарылася так, як гэта і павінна было здарыцца з сапраўдным паэтам. Трапіўшы ў Іран, ён яшчэ лепш пазнаў Беларусь і глыбей пачаў пра яе пісаць. Сябры чакалі ад яго экзатычных вершаў пра «Шаганэ», а ён ім прыслаў добрыя вершы пра Беларусь.

А калі Панчанка і піша аб Іране, дык бязлітасна разбурае міф аб экзатычнай прывабнасці гэтай краіны. І робіць ён гэта не для таго, каб паказаць сябе арыгінальным ў параўнанні з сваімі папярэднікамі, а каб расказаць праўду аб краіне. І, сапраўды, нельга не паверыць довадам паэта:

І дзе яны, князевы дочкі,
Што эзялі заморскай красой?
Вось гэта, што чэрпае з бочкі
Руды селядцовы расол?
Ці тая гандлярка худая,
Што варыць з баранінай плоў?
Іду я, і злосць разбірае:
Ну, хто гэта казак наплёў?
Няма тут ні княжнаў, ні бітваў.
Сцвярджаю.
Я ўсё абышоў.
Купіў на ўспамін сабе брытву
Ды пачак ангельскіх нажоў.

Вельмі пераканаўча разбурае паэт у гэтым творы ўсе рамантычныя ўяўленні аб поўдні. Канцоўка верша і тут нечаканая. Адзінае вартае, што знайшоў Панчанка ў гэтай краіне — гэта брытва і нажы да яе, і тыя замежнага паходжання.

Ёсць у Панчанкі верш «Бутэлька «Цынандалі». У ім паэт апісвае іранскі рынак. Як чалавек наглядальны, ён бачыць на гэтым рынку ўсё: шапку мараканскага зуава, чоткі, золінгенскія нажы, шофераў ангельскіх рукавіцы і г. д. Але гэта вершаванае апавяданне набывае глыбока паэтычны характар у наступных радках:

Кніг індускіх я чытаць не ўмею,
Шоўк не для салдата. Дываны?
Гэта — рэч. Усходняй казкай вее.
Вось, калі-б іх бачыў да вайны.

І далей выказаны боль, выкліканы ўспамінамі аб разрабаванай фашыстамі Беларусі:

Будзе яшчэ некалі багатым
Мой адбудаваны новы дом.
А цяпер няма ў мяне і хаты.
Попел не прыкрыеш дываном.

Але як горача любіць паэт гэтыя свае родныя папялішчы, як імкнецца да іх. Скажам проста — часамі гэтая, ні з чым непараўнаная, любоў да свае Беларусі засланяе Панчанку што-нішто з цікавага, што ёсць у Іране. Але хто тут папракне паэта? У яго свая праўда, якая выражана ў творах бясконца моцна. Сапраўды трэба пабываць у чужых землях, каб яшчэ мацней палюбіць Радзіму:

Мы сягоння на чужой чужыне
Сядзем па-сяброўску за сталом,
Пасумуем па сваёй краіне,
Песню «А ў бары, бары» спяём.

Гэтым-жа пачуццём сагрэты і верш «Сустрэча з бярозай», «Слухаючы «Перапёлку», «Ты чуеш курлыканне» і другія.

У вершы «Сустрэча з бярозай» Панчанка апавядае аб тым, як з Магілеўскага бору ішла за ім у Іран бяроза, каб забраць з сабою дахаты.

Мы доўга стаялі з бярозай удвох
На нейкай нізіне
У нейкім Іране,
І так размаўлялі, што горы і лог
Ад рэўнасці дзікай ў тузе паміралі.

У другім вершы «Слухаючы «Перапёлку» паэт гаворыць пра тое, як

Маленькая птушка сыпнула з крыла
На сэрцы нястынучым попелам
мінскім.

А ў вершы «Ты чуеш курлыканне», гледзячы, як вясной з выраю лятуць у Беларусь журавы, Панчанка з вялікай тугой крычыць у прастор:

Гэй, хто там да болю знаёмы фільм
З канца пачынае круціць!

Толькі бязмежная любоў да свае Беларусі магла нарадзіць такія выдатныя радкі, вартыя лепшых совецкіх паэтаў.

Але не толькі пачуццё гневу і болю жыве ў душы паэта. Бясконца багатае пачуццямі сэрца, мастацкі густ дыктуюць яму задачу — змякчыць гэты крык, які вырваўся з душы, наступнымі радкамі. І ён піша, з адценнем гіроніі, па адрасу тых паэтаў, якія мараць пра крыллі і збіраюцца ляцець, «як матылі, як матылі»:

Я зайздрасці к птушкам ніколі не
меў—
Без крылляў мне нават ямчэй,
А зараз ад крыўды глухой анямеў
І з неба не зводжу вачэй.

У нас цяпер спрачаюцца аб запазычанні чужых паэтычных інтанацый, але яснасці ў гэтым пытанні няма. Можна запазычаць, ці нельга? Запазычаць, безумоўна, можна, але справа ў тым, як запазычаць і для чаго. Можна запазычаць чужыя інтанацыі, але не спяваць з чужога голасу. Класікі запазычалі гатовыя сюжэты, але асэнсоўвалі іх па-свойму. Калі свайго ў вершы нічога няма, а інтанацыя запазычаная, ствараецца ўражанне, што паэт напісаў не верш, а пераказ з чужога твора. Калі ў паэта ёсць свой голас, ніякае запазычанне чужых паэтычных інтанацый яму не страшна, а часамі, наадварот, неабходна. Куляшоў выкарыстаў рытм Купалы, але перафарміраваў яго на свой узор, Панчанка выкарыстоўвае інтанацыі Маякоўскага, але застаецца самастойным паэтам. Часамі Панчанку інтанацыя Маякоўскага патрэбна для адштурхоўвання ад яе, часамі для падкрэслівання аднолькавасці душэўнага стану з станам, у якім мог быць Маякоўскі, часамі для гіроніі. Але ўсюды гэта не гучыць перапевам, бо ў Панчанкі свая тэма, свой голас, свая манера пісьма.

Вось, напрыклад, верш «Што я думаў, гледзячы на Каспійскае мора?». Тут Маякоўскі адчуваецца і ў радках:

Адным вось такое раскошнае мора,
Другія-ж не маюць мізэрнага морачка.

альбо:

Для прыкладу — горы.
Хацеў я аднойчы
У Грузіі сперці славуты Казбек.
Ён сам прызнаваўся не раз мне,
што хоча
Бліжэй перабрацца да нашых рэк.

У вершы «На Ардабільскім перавале» таксама адчуваецца Маякоўскі:

Я не стрымаўся ад спакусы,
Стаў верш пісаць ля гулкіх вод,
На плечы нейкага Эльбруса
Паклаўшы верны свой блакнот.

Чаму-ж вершы Панчанкі, дзе ёсць інтанацыі паэзіі Маякоўскага, разам з тым з'яўляюцца глыбока самастойнымі і арыгінальнымі?

Таму, што запазычанне ў Панчанкі зусім арганічнае для яго твораў. Іменна мовай Маякоўскага павінен быў загаварыць паэт, сустрэўшыся з волатамі — Казбекам і Эльбрусам. Але адначасна Панчанка не пнецца да позы Маякоўскага — аграмадзіны, якая магла-б, як роўная з роўнымі, размаўляць з горамі. Панчанка пра сябе насмешліва піша:

І я з вар'яцкай гэтай высі,
Бездапаможны і малы,
На мусульманскі край дзівіўся,
Прыклеіўшыся да скалы.

Тое-ж самае і ў вершы «Размова з ішаком», дзе ёсць такія, напісаныя ў духу Маякоўскага, радкі:

Падумаеш—хітрасць у рыфмы цаляць
У садзе, ружовым ад сораму.
А вось паспрабуй напісаць пра
цялят,
Што пасвіць іранец пад зорамі.

Але і тут паэт застаецца самім сабой — насмешлівым і злосным, вясёлым і задуменным, уладарным і бездапаможным.

Пімен Панчанка ў апошніх сваіх вершах усё больш і больш ідзе да самастойнасці ў рытме, падслуханым у жывой гаворцы, з галасоў жыцця.

Гартанная песня завязла ў вушах,
Ад пылу зрабіўся я мельнікам.
Раве, нібы дрэнны актор, мой ішак,
Здзекуецца з пісьменніка.

Добрае адчуванне рытма, патрэбнага зместу верша, ёсць і ў творы «За Валдайскімі сопкамі».

За Валдайскімі сопкамі
Сёлы рускія зноў гараць.
За лясамі высокімі
Плачуць Порхаў і Ноўгарад.

Гэтая працяжнасць, якая ёсць у заключным радку страфы, як-бы перадае плач Порхава і Ноўгарада, што здалёку далятае да паэта.

Уменне ў рытме рабіць пераходы, якія сэнсава ўдакладняюць верш, робяць яго больш жывым і гнуткім, мы заўважаем у вершы «Зубры».

Меркавалі наіўна лясныя быкі:
«Нас мала, паслужым сумленна на-
вуцы».
. . . . . .
Зубры паміраць ад бамбёжкі не
хочуць.
Глядзяць на мяне іх журботныя вочы:
«Парай, што рабіць—
Мычэць ці маўчаць,
Ці рогі крутыя
У кроў мачаць?»

Як майстра сюжэтнага верша выяўляецца Панчанка ў апошнім цыкле, у які ўваходзяць вершы «Сват», «Бульба», «Ля дзявочай кватэры № 5».

Кожны з гэтых твораў — гэта маленькая навела, дасціпная, з яркім сюжэтам. У вершы «Сват» паэт апавядае аб тым, як, будучы супрацоўнікам армейскай газеты, ён сасватаў «можа роту, а мо' батальён», а сам застаўся без нявесты. У жартоўным вершы «Бульба» аўтар усхваляе перад сваімі таварышамі - байцамі стравы, якія можна зварыць з бульбы. А ў вершы «Ля дзявочай кватэры № 5», абражаны ўяўнай здрадай дзяўчыны, гаворыць з гэтага поваду даўгую тыраду.

Усе гэтыя вершы цікавыя, асабліва, калі ўлічыць тое, што ў беларускай літаратуры невялікая колькасць сюжэтных вершаў. І ў гэтых творах мы ўсюды бачым прыемную паставу вясёлага летуценніка-паэта, які сумуе і радуецца, кахае і расчароўваецца, кагосьці ў нечым пераконвае, жартуе з сваіх сяброў і з самога сябе.

Але ў гэтых вершах выяўляецца і пэўная небяспека для паэзіі Панчанкі, калі не лічыць, што яны з'яўляюцца толькі эпізодам у яго творчасці.

Па-першае, ва ўсіх вершах крышачку адчуваецца поза. Бачыце, які я дасціпны, а ў той-жа час я самы наіўны і бездапаможны, — нібы кажа нам паэт. Нешта накшталт: «На закате ходит парень возле дома моего». Гэта асабліва адчуваецца ў вершы «Ля дзявочай кватэры № 5». Вось гэты ўхіл паэзіі Панчанкі ў бок прыдуркаватага «парня» з верша «На закате ходит парень», быў-бы вельмі непажаданы.

Па-другое, такія вершы не вырашаюць чыста паэтычных задач. Рытм іх мёртвы, — бо гэта невялікія апавяданні ў вершы, дзе ёсць толькі сюжэт, але няма ні яркага параўнання, метафары, ні арыгінальнага рытмічнага ходу, ні свежай рыфмы, ні ўзлёту паэтычнай думкі.

Вышэй мы гаварылі аб тым, што толькі цяпер сфарміравалася творчае аблічча Панчанкі, але тым не менш, яшчэ і цяпер у яго сустракаецца нямала бязлікіх вершаў. Асабліва гэта адчуваецца ў вершах 1943 года. У зборніку «Далёкія станцыі», які неўзабаве выйдзе ў свет, ёсць нямала вершаў слабых, агульных, сентыментальных. Гэта такія вершы, як «Арт-абстрэл», «Яшчэ рана, хлопцы...», «Балада пра Міколу Сасноўскага», «Курганы», «Не, гэта не апошняя аповесць», «Начны мсцівец», «Думы салдата», «Маё і тваё маленства».

Па-першае, у гэтых вершах няма арыгінальнага, толькі Панчанку ўласцівага вырашэння тэмы, пераважаюць агульныя развагі.

Толькі не, мы не згінем, тэўтонаў
адужаем!
Аніводнаму з іх больш на свеце не
жыць.
Па-над мёртвай ардой, над крыва-
вымі лужамі
Груганы будуць з радасным
крыкам кружыць.

ці:

На вогненай зямлі ў сталёвым
свісце
Тут кожны воін б'ецца за траіх.
Як мала сіл, каб стаць іх летапісцам,
Як мала слоў, каб расказаць пра іх.

Па-другое, у некаторых вершах Панчанкі адчуваецца сентыменталізм у вырашэнні трагічных тэм вайны. У такім сентыментальным плане напісаны верш «Начны мсцівец». У вершы апавядаецца, як лётчык Адам Краўчук, выконваючы загад, ляціць на бамбёжку горада, у якім жыў да вайны. Але замест суровых слоў у Панчанкі тут пераважаюць сентыментальныя:

Мой любы край, зямля мая!
Ты чуеш? Гэта я —
Твой родны сын Адам Краўчук...

Трэцяя хіба вершаў Панчанкі састаіць у тым, што ў некаторых з іх ён ідзе па пратаптанай сцежцы так званай «франтавой», «афіцэрскай» лірыкі. У такой лірыцы асноўная якасць змагара — гэта быць «мужчынам», падміргваць рэгуліроўшчыцам на франтавых дарогах, піць з паходных фляг, лаяць АХО і Ваенторг.

А калі надзеліць куляй лёс—
Смерць сустрэнем чэсна, як муж-
чыны,—

піша Панчанка.

Альбо вось другі ўзор такой «афіцэрскай» лірыкі:

Нам за многае піць-бы і піць-бы,
Ды АХО памянуўшы як след,
Запявай, што да свадзьбы-жаніцьбы
Мы дажыць-бы хацелі, сусед.

ці:

Рэгуліроўшчыца з кволымі рысамі,
На скрыжаванні дарог франтавых,
Ты завалодала эмкамі, зісамі,
Сэрцам маім і сяброў маіх.

Трэба адзначыць, што бескаляровымі з'яўляюцца і вершы Панчанкі пра каханне, уключаныя ў гэту кнігу. Гэтыя вершы залішне гладкія, ураўнаважаныя:

Я прысягаў не раз, не двойчы
Не абуджаць у сэрцы зноў
Тваю паходку, стан дзявочы,
Загадкавых апошніх слоў.

А калі часамі паэт і бунтуе супроць гэтай ураўнаважанасці пачуццяў, як, напрыклад, у вершы «Каханне і пошта», дык гэты «бунт» не дасягае мэты, бо сама тэма, выкарыстаная ў вершы, вельмі дробная, у ёй мала паэтычнай узнёсласці.

Хочацца верыць, што агульшчына і сентыменталізм у вершах Панчанкі 1943 года — гэта пройдзены этап, а хібы апошніх вершаў — толькі эпізод у яго творчасці.

Пімен Панчанка цікавы для нас, як паэт, што глыбока вырашае праблемы ў сваіх творах, а не паўтарае агульныя словы, або прыкідваецца блазнам.

Панчанка дарагі нам, як паэт, які сур'ёзна думае над лёсам сваім, свае радзімы. У такіх вершах дарэчы гучаць і яго жарты, і гіронія ў дачыненні да сябе і сваіх сяброў, і злосць, і лірычная чуласць, і сарказм.

Увогуле-ж Панчанка стаіць на правільнай дарозе.

Пімен Панчанка нарадзіўся ў 1917 годзе. Яму цяпер дваццаць восем гадоў, і ён знаходзіцца ў росквіце творчых сіл.

У асобе яго наша паэзія мае яркі і самабытны талент.

«Ваўкі і авечкі» А. Н. Астроўскага ў Беларускім Дзяржаўным драматычным тэатры імя Я. Купалы.

На здымку: арт. Л. Ржэцкая ў ролі Мурзавецкай, арт. В. Галіна—Купавінай, арт. С. Бірыла—Беркутава, арт. Р. Кашэльнікава — Глафіры і арт. Э. Шапко ў ролі Лыняева.

М. МОДЭЛЬ

АКТОР І ВОБРАЗЫ

(Сямён Дрэчын)

Калі гарматы з «Аўроры» стралялі па Зімняму палацу, будучаму артысту беларускага балета С. Дрэчыну споўнілася ўсяго толькі два гады. Так пачалася яго жыццёвая, а потым і творчая біяграфія, падобная на біяграфіі многіх дзеячоў мастацтва, росквіт таленту якіх стаў магчымым толькі ў выніку перамогі Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі.

Наша першае знаёмства з С. Дрэчыным адбылося на спектаклі «Чырвоны мак» Гліера ў Мінску, у Беларускім тэатры оперы і балета. Гэта быў спектакль, сагрэты тэмпераментам маладосці, але пазбаўлены паслядоўнага рэалізма.

Дрэчын, які прышоў у тэатр з мастацкай самадзейнасці, з хваляваннем дэбютанта танцаваў у гэтым спектаклі першую ў сваім жыцці балетную партыю.

Радасць нашага спаткання з маладым танцорам была няпоўнай. Яе сапсавала ўражанне ад сцэнічнага тлумачэння вобраза. Віной гэтаму была «шанхайская» экзотыка і хваравітая манернасць кампазіцыі і рысунка танцаў — вынік экспрэсіяністкай задумы балетмайстра. Аднак, таленавітасць Дрэчына прабівалася нават праз няўдалую фармалістычную рэжысуру спектакля. Тонкае пачуццё рытма, гнуткасць і мяккасць ліній танца ўжо тады прывабілі нас да здольнага юнака.

Пасля «Чырвонага мака» Дрэчын трапіў у жыццерадасную камедыйную стыхію «Капеліі» Дэліба і Пеціпа. З далёкага Кітая ён апынуўся ў Галіцыі 70-х гадоў XVIII стагоддзя. Гуцульскі народны танец быў больш блізкім па духу і зразумелым беларускаму артысту. Бесклапотны і вясёлы салдат Франц запомніўся нам сваім светлым гумарам, юнацкім задорам і эмацыянальнасцю. Пачуцці Франца да любімай Сванільды Дрэчын перадаў з асаблівай паўнатой у адажыё-дуэце трэцяга акта «Капеліі».

Неспрактыкаваны ў пантаміме Дрэчын у танцы праявіў сапраўдную артыстычнасць.

Творчай удачай для артыста быў вобраз прынца ў цудоўным балеце П. Чайкоўскага «Лебядзінае возера». Тут з асаблівай яркасцю раскрыўся тэмперамент Дрэчына, яго варожасць да манернасці і шляхетнасці звычайных балетных кавалераў. У гэтым спектаклі Дрэчын паказаў, што ён не належыць да тых салістаў, якія ў па-дэ-дэ трацяць сваё індывідуальнае аблічча.

У вобразе прынца Дрэчын абрадаваў нас сваёй псіхалагічна-выразнай драматычнай ігрой, ясным разуменнем прымата музыкі Чайкоўскага над сцэнарыем балета. Надзвычай прыемнае ўражанне засталося ад яго прыгожых узлётаў, хараства поз, надзвычайных піруэтаў.

Аднак, галоўнае ў вобразе, створаным Дрэчыным, гэта—навізна задумы, якая праявілася ў адыходзе артыста ад традыцыйна-лірычнага тлумачэння партыі.

Асабліва моцным быў Дрэчын у тэхнічна-бліскучай варыяцыі з Одыліяй. Эстэтычную асалоду і глыбокае хваляванне выклікала яго пяшчотнае адажыё з лебедзем (другі акт).

Тэма Гірэя, вобраз якога Дрэчын паказаў на беларускай сцэне, вызначана В. Бялінскім, як «прасвятленне дзікай душы праз высокае пачуццё кахання».

Патрэбна была добрая мастацкая інтуіцыя, каб данесці да гледача думку Бялінскага аб Гірэю. Нам здаецца, што гэта Дрэчыну цалкам удалося. Змена душэўнага свята Гірэя пад уплывам кахання да Марыі была раскрыта артыстам з выключнай пераканальнасцю. Удача артыста тут была асабліва важнай таму, што Гірэй не танцавальная, а мімічная партыя — зусім новы жанр для Дрэчына. Гірэй быў дасягненнем саліста і вынікам дасканалага авалодання мастацтвам пантамімы, якая вельмі рэдка прыносіць творчае задавальненне балетным артыстам.

Лейттэмай вобраза Гірэя-Дрэчына стала перамога чалавека над дзікуном.

Калі для паглыблення камедыйных здольнасцяў Дрэчына ўдзячным матэрыялам былі «Дарэмная перасцярога» Гертэля і «Дон Кіхот» Мінкуса, дык для развіцця лірыка-драматычнага тэмперамента артыста вялікую ролю адыграў першы беларускі балет «Салавей» М. Крошнера. У «Салаўі» найбольш ярка праявіўся талент С. Дрэчына. Танцавальны стыль «Салаўя» ў пастаноўцы А. Ермалаева (лібрэта Ю. Слонімскага) не звычайны для балетнага тэатра. Тут няма класічнага «гранд-па» і адсутнічае бяскрылы рэалізм.

Адменнай наватарскай асаблівасцю спектакля «Салавей» з'яўляецца пераасэнсаваны, на класічнай балетнай аснове, беларускі танцавальны фальклор. Гэтую асаблівасць балета Дрэчын успрыняў.

Сымон-Дрэчын паяўляецца пасля адкрыцця заслоны на маляўнічым фоне вясенняга беларускага пейзажа. Ён не зрабіў яшчэ ніводнага руху. Аднак, сустрэўшыся позіркам з акторам, вы адчуваеце, чым перапоўнена душа юнака, што яго хвалюе. І калі пачынаецца танец кахання, святла і шчасця, ён успрымаецца, як імкненне сэрца Сымона выліць свае пачуцці ў танцы.

Дрэчын у натхнёным танцы апавядае аб любві да жыцця, аб прыгожым і радасным пачуцці да Зоські, аб гневе да Макара і панскіх гайдукоў.

Эмацыянальны стан душы Сымона адкрываецца акторам у сумным адажыё з Зоськай, у імклівых, як віхор, варыяцыях, у поўным народнага гумару «Юрачцы».

«Юрачка» ў «Салаўі», як і іншыя беларускія танцы — не механічнае перанясенне фальклора ў тэатр, а сюжэтны танец з яснай задумай. Музыка «Юрачкі», «Лявоніхі», «Крыжачка», «Бульбы» сваёй прывабнай меладычнасцю надае асаблівае хараство ансамблевым танцам, дуэтам і соло, сагрэвае іх.

Захоўваючы рамантычнасць класічнага танца, Дрэчын у партыі Сымона даў яму жывыя чалавечыя пачуцці і адчуванні. У гэтых адчуваннях Салаўя раскрываецца хвалюючая гісторыя народных талентаў у далёкім і змрочным мінулым; гісторыя барацьбы народа і яго ідэйная перамога над цёмнымі сіламі, ад якіх сонцам Кастрычніцкай рэволюцыі назаўсёды вызвалены беларускі народ.

Яркая ўдача вобраза Сымона—вынік тонкага раскрыцця акторам нацыянальных асаблівасцяў героя, яго адменных нацыянальных рысаў. Сымон Дрэчына—беларускі народны герой і разам з тым яго адчуванні, яго вольналюбства з'яўляюцца агульначалавечымі пачуццямі.

С. Дрэчын — балетны артыст з вялікімі патэнцыяльнымі магчымасцямі, якія яшчэ павінны быць раскрыты ў яго будучай творчай дзейнасці.

ДА КАСТРЫЧНІЦКІХ СВЯТ

Беларускі Дзяржаўны ансамбль песні і танца пад мастацкім кіраўніцтвам Шырмы падрыхтоўвае да дня 28-й гадавіны Кастрычніка наступныя новыя песні і танцы: «Пагібель «Варага», музыка Сядога, «Накцюрн» Пукста, «Захліцеў я жаніціся» Аладава, беларускі народны танец «Мяцеліца», рускія лірычныя танцы, венгерскі і другія.

* * *

Аркестр народных інструментаў Беларускай Дзяржаўнай філармоніі апрацоўвае да свята музыкальную карціну «Зязюленька», «Як пад яблынкай», беларускую польку, фантазію на беларускую тэму кампазітара Цікоцкага і інш.

Народныя песні ў выкананні салістаў Дзяржаўнай філармоніі суправаджае аркестр.

У святочныя дні аркестр будзе абслугоўваць Мінскую абласць.

* * *

Сімфанічны аркестр Дзяржаўнай філармоніі падрыхтоўвае другую сімфонію кампазітара Г. Пукста, у якой аўтар скарыстаў некалькі беларускіх народных песень.

* * *

Брыгады Дзяржаўнай філармоніі ў дні свята абслужаць абласныя цэнтры: Гомель, Віцебск, Баранавічы, Гродна і другія.

У калоннай залі Акруговага Дома афіцэраў у дні свята адкрываецца выстаўка работ майстроў народнай творчасці БССР. Урачыстае адчыненне выстаўкі адбудзецца 8 лістапада. На выстаўцы будуць прадстаўлены карціны мастакоў-самавучак, работы разьбяроў па дрэву і скульптараў, узоры мастацкага вышывання, дзіцячыя лялькі і г. д.

* * *

Рэспубліканскі Дом народнай творчасці рыхтуе на свята 7-га лістапада канцэрт, удзельнікамі якога будуць лепшыя салісты горада Мінска, хор Вялікага Падлесся пад кіраўніцтвам этнографа Цітовіча, Баранавіцкі інструментальны ансамбль пад кіраўніцтвам Андрушкевіча, вакалістка Карчагіна—работніца чыгункі гор. Баранавічы і другія.

* * *

У пачатку лістапада з Масквы пераехаў на сталую работу ў Мінск Беларускі Дзяржаўны джаз-аркестр пад мастацкім кіраўніцтвам заслужанага артыста БССР Эдзі Рознера.

У дні Кастрычніцкага свята джаз-аркестр выступіць у Мінскім Акруговым Доме афіцэраў.

АЛЕСЬ ЗАРЫЦКІ

У КАМЕНЦЫ

1941 год. Пачатак лістапада. Пасля жорсткіх баёў пад Мцэнскам нашы часці перакінуты на абарону Масквы. Мы занялі пазіцыі ў раёне вёскі Каменкі, што ляжыць на Варшаўскай шашы ў 80 км ад сталіцы.

Ёсць пад Масквою Нара-рэчка
Маленькая, як Пліч ці Друць.
Мы там стаялі ля мястэчка,
Якое Каменкай завуць.
Прыгожыя вакол мясціны —
То луг, то стромкі бор, то гай,
Старыя ліпы, арабіны
Вартуюць падмаскоўны край.

У бой мы ўступілі, як кажуць, «з ходу» і нават не мелі часу акапацца як след.

— Назад ні кроку, за намі Масква!— гэтай адказнейшай з адказнейшых задач было запоўнена сэрца кожнага байца і камандзіра. Каменка павінна застацца нашай. Вялікі ўздым панаваў сярод нас. Вера ў наш поспех была непахіснай.

І не патрэбна дбаць аб цудзе,
Разбіцца хвалі аб уцёс, —
Расія ёсць, была і будзе,
Бо лёс Расіі — свету лёс.

Падмаскоўе. Гістарычныя мясціны славы рускай зброі ў Айчыннай вайне 1812 года.

Таруціна ў суседстве з намі,
Сяло вядомае усім,
Дзе помнік высіцца з арламі
Яшчэ кутузаўскіх часін.

Слаўныя дзеянні нашых продкаў натхнялі нас. Але Масква была блізка.

Закіпеў страшны бой. Дзве адборныя нямецкія дывізіі — 15-ая і 34-ая—шалёна атакавалі наша невялікае злучэнне, якое мела тады ўсяго 4 батальёны. Асабліва вялікія надзеі ўскладалі немцы на сваю 34-ую, якую яны, мусіць, для большай рэкламы, называлі дывізіяй «крывавых прывідаў». Гэтыя «прывіды» наносілі ўдар на галоўным кірунку— усіняж шашы на Каменку.

Няма слоў, каб апісаць мужнасць, з якой нашы байцы і камандзіры біліся з ворагам. Біліся да апошняга. Невялікая Нара была завалена нямецкімі трупамі. Аднавокі бандыт, генерал-лейтэнант Белендорф, які камандаваў гэтымі прывідамі, шалеў ад злосці і кідаў у наступ «хвалю» за «хваляй». Да 7-га лістапада напружанне бою дасягло свайго апагею.

Помню такі эпізод. Адна з нашых рот займала вельмі важную пазіцыю на беразе Нары. Нямецкі батальён, пераправіўшыся цераз раку, ўклініўся ў яе распалажэнне. Фрыцы былі знішчаны ў рукапашным баі. Ніхто з іх не вярнуўся назад. Гэта было пад вечар 7-га лістапада. Я ніколі не забуду гэтага ляснога ўзбярэжжа. Мне з маім начальнікам, нябожчыкам маёрам Дабравольскім, даручылі праверыць гэты ўчастак. Там стаяла цішыня, і толькі тры-чатыры чалавекі ўзняліся з зямлі пры нашым з'яўленні.

— Дэсантнікі спалохаліся, не пайшлі ў контратаку, — сказаў маёр.

— Таварыш маёр, а каму ісці, — адказаў адзін з іх. І сапраўды, прыгледзеўшыся, мы ўбачылі, што з тых, хто ляжаў, ніхто ўжо ўзняцца не мог. Героі палі ў няроўнай барацьбе. Побач ляжалі трупы зялёных немцаў — перабіты батальён «крывавых прывідаў».

Мы знялі шапкі.

8-га атакі ворага спыніліся. Немцы захлынуліся ва ўласнай крыві. Мы спынілі звера, і фрыцы больш і не спрабавалі наступаць у гэтым напрамку.

З вялікай нецярплівасцю сталі мы чакаць загада Вялікага Сталіна аб наступленні, каб канчаткова разлічыцца з ворагам.

Так мы сустракалі вялікае свята Кастрычніка чатыры гады таму назад.

Адгрымелі бітвы. Пад вадзіцельствам геніяльнага Сталіна Чырвоная Армія разбіла дашчэнту крывавых прывідаў і назаўсёды выгнала іх з нашай Радзімы. Вялікай радасцю перамогі напоўнены нашы сэрцы. Але не забудзем у дзень нашага свята ўспомніць і тых, хто аддаў сваё жыццё за наша шчасце тады, у тыя суровыя дні, каля тысяч Каменак, на ўзбярэжжах і Нары, і Волгі, і Нявы.

Валянцін Таўлай

КАСТРЫЧНІЦКІ САЛЮТ

Грыміць кастрычніцкі салют...
Здаецца — гэта гром «Аўроры»
Ускалыхнуў здалёк зямлю,
І толькі ападаюць зоры,
Ды рэха паўтарае залп,
Каторым салютуюць шчыра
Крутыя верхавіны Альп,
Граніты звонкага Паміра.

Закончан слаўны наш паход,
Цвярдыні ворага — ў руінах.
Стары крыжацкі шлях на ўсход
Прыгвожджаны к пляцам Берліна.
Бары — як некалі гудуць,
Зноў скібы чорныя — пад плугам,
І дробяць гарнякі руду,
Шахцёры высякаюць вугаль.

І на стырне гадоў — рука,
Якая наша пакаленне
Вядзе ад самых барыкад,
Што ўзняў над цэлым светам Ленін.

Арт. Л. Ржэцкая і Л. Шынко ў песе К. Сіманава «Рускія людзі».

На святочным сходзе

ФЕЛЬЕТОН

На ўрачысты сход літаратурных герояў з'ехаліся «персанажныя вобразы» усіх паэм, апавяданняў, раманаў, п'ес і аповесцяў. Цэлымі плоймамі яны перлі ва ўсе дзверы вялікай залі, спяшаючыся заняць месца, адпаведнае сваёй літаратурнай вартасці. Уперад усіх намагаўся прарвацца ў залю і сесці ў першым радзе зухаваты дзед Міхед. Ды дзед Талаш з Астапам адцягнулі яго за штаны назад і аблаялі прыдуркам. Уперад прапусцілі некалькі паважаных літаратурных дзядоў, каб іх не заштурхалі падшывальцы Якімовіча і Маўра. Праўда, дзядоў аказалася больш, чым маладых, бо кожны пісьменнік і паэт, які паважаў сябе больш ад іншых, лічылі найпершым абавязкам мець свайго літаратурнага дзеда.

Але мала хто з іх падбаў адзначыць гэтага дзеда чым-небудзь. І калі дзяды сабраліся, выйшла блытаніна. Прышлося зрабіць ім перакліч, хто чый. Непаразуменне выйшла і з некаторымі гістарычнымі героямі. На адно месца, напрыклад, прэтэндавалі аж тры Кастусі Каліноўскіх. Оперны Каліноўскі, спакойна выспеўваючы рулады, пайшоў на сваё месца, затое драматычныя хлопцы, абодвы гарачыя, адразу хапіліся за грудкі.

Не паспелі ўтаймаваць Каліноўскіх, як у другім канцы залі пачуўся страшэнны львіны рык. Машэка з «Магілы льва», заняў сваё належнае месца, але яго нечакана ўдарыў нехта дручком па галаве Азірнуўшыся, ён убачыў за сваёй спіной Машэку Вольскага. Той таксама квапіўся на гэта месца. Пайшлі ў ход дручкі. Хто ведае, чым скончылася-б гэта далікатная размова, каб не ўмяшаўся бацька Мінай. Ён угаварыў Машэку з «Магілы льва» пашкадаваць свайго сабрата, бо ён і так не вельмі дужы. Каб пазбегнуць далейшых сутычак, Машэку Вольскага пасадзілі ў другім канцы залі.

У ложы ўзгарэўся новы скандал сямейнага характару. На сход прышла Аксання з мужам, але за Аксанняй прыплёўся і тэнкіст Лістоў. Муж гнаў яго ў каршэнь і даводзіў, што, як сцвярджае Бялевіч, ён не павінен больш прыставаць да Аксанні, а Лістоў крычаў, што Бялевіч нічога не разумее ў каханні.

Толькі Жлукта і Гарлахвацкі былі ўпэўнены, што іх месцы ніхто не зойме. Яны пілі па блату ў буфеце піва і мерыліся заняць па знаёмству яшчэ месцы ў прэзідыуме.

У залі даўно ўжо супакойваў публіку дзед Талаш. То добрым, то шматпавярховым словам ён заклікаў хутчэй асесці і суцішыцца. Але ў залі пераважалі героі літаратурных твораў— партызаны. Тут можна было бачыць і лясных салдат, і салдат з шумных лясоў. Ва ўсіх іх былі білеты на галёрку, а яны з аўтаматамі і гранатамі пракладалі сабе дарогу ў партэр. Толькі атрад палешукоў добрасумленна заняў свае месцы на галубятні.

Публіка сяк-так утаймавалася.

— Ітак, таварышы, наш першы сход, прысвечаны літаратурнаму герою, давайце будзем лічыць адкрытым!..

Зал патануў у грохаце авацыі і аўтаматнай страляніны. Пасля абралі прэзідыум. Старшыня аб'явіў парадак дня. Спачатку ўрачыстая частка, пасля будзе канцэрт сіламі літаратурнай мастацкай самадзейнасці з удзелам Сымона Музыкі і Салаўя.

— Таварыш старшыня! — азваўся нехта з партызанскіх радоў.—У парадку вядзення схода я прапаную ўключыць пытанне аб дэмабілізацыі... У Чырвонай Армії ўжо другая чарга едзе дамоў, а мы—літаратурныя героі-партызаны ўсё яшчэ пускаем пад адкосы нямецкія эшалоны... а мы-ж таксама хочам вярнуцца дамоў і пачаць мірна жыць і працаваць.

— Правільна!

— ...Вы-ж паглядзіце, колькі нас сабралася сёння. Бадай адны партызаны! А навошта ў мірны час такая армія?

— Правільна!

— ... Па-мойму, трэба пакінуць у літаратуры камандны састаў партызанскай арміі, а ўсіх астатніх — дамоў!

— А дзе-ж той камандны састаў?— зазначыў нехта. — У нашай-жа літаратуры няма яшчэ добрых партызанскіх камандзіраў. Вось іншых герояў у нас хапае... Сёння, напрыклад, на адно месца прышлі тры Каліноўскіх, тры Машэкі, а крэсла Заслонава, як бачыце, пустае. На яго ніхто нават не асмеліўся прэтэндаваць... У нашай літаратурнай арміі няма ніводнага партызанскага генерала, а ў жыцці яны ёсць...

— Правільна!

— Згодзен, таварышы, — рэзюміраваў старшыня. — Мне здаецца, што нам трэба будзе пасесці шырокую выхаваўча-растлумачальную работу сярод нашых аўтараў за пераключэнне на тэматыку мірнага будаўніцтва, а цяпер мы ўсё-такі, пярэйдзем да пытання нашага святочнага схода.

Слова было прадастаўлена дакладчыку, вылучанаму са шматлікіх твораў Ільі Гурскага.

— Беларусы! — пачаў дакладчык і адразу захліпнуўся ад наплыву высокіх пачуццяў. Прыхінуўшы да твара насавік, ён прадаўжаў ужо са слязой на вачах.

— Мы беларусы. І часопіс у нас, таварышы, таксама «Беларусь».—Больш дакладчык нічога не мог сказаць. Горла сціснулі спазмы, вочы і нос адсырэлі. Дакладчык плакаў, як бабёр.

— Прабачце, таварышы, але часопіс «Беларусь» — маё кволае месца... Ітак, — прадаўжаў ён ужо больш спакойна, — дазвольце павіншаваць вас з першым сходам літаратурных герояў. (бурныя авацыі). За дваццаць восем год нашага літаратурнага жыцця мы ўпершыню сабраліся сёння, і што-ж мы бачым! Мы бачым нешта цудоўнае і велічнае... Нас многа! Колькі, аказваецца, вырасла нас за дваццаць восем год! Праўда, не ўсе літаратурныя героі дажылі да сённешняга дня. Некаторыя сканалі і пакрыліся пылам у кніжных шафах... І мы нават не можам ім сказаць сёння: вечная вам памяць, браткі! Такі ўжо лёс літаратурнага чалавека: памяць аб ім жыве, пакуль жыве ён. Але жывых нас больш. Усе мы здаровыя, бадзёрыя і збіраемся доўга жыць, калі выдавецтва паможа. Нашы пісьменнікі і паэты могуць ганарыцца шматлікай сям'ёй сваіх герояў.

Дваццаць восем год назад нас было куды меней. Нас мала хто прызнаваў, а цяпер мы — паважаныя госці за ўсіх нашых суседзяў, мы выйшлі на вялікую літаратурную арэну народаў! Чэсць і слава нашым творцам! (Бурныя, доўга не змаўкаючыя авацыі).

Спецкор Піліп КАРАНДЗЕЙ.

МІКОЛА ЛУПСЯКОЎ

ПАД РЖЭВАМ

Захара Лешчака мабілізавалі ў армію напярэдадні фінскай кампаніі. Дома ў яго засталіся маці і жонка, якая чакала дзіця. Ужо недзе за Петразаводскам, калі часць уступіла ў бліі з белафінамі, ён атрымаў з дому ліст, што жонка радзіла сына. З таго дня гэты чалавек усюды і заўсёды думаў і гаварыў аб сваёй вёсцы, сям'і і сыне, які рос без яго і якога ён сам не бачыў...

Ўпершыню я сустрэўся з Лешчаком у артылерыйскім палку восенню 1942 года пад Ржэвам. У той час ён ужо камандаваў гарматай і меў званне старшыны. Гэта быў высокі плячысты чалавек з скуластым шырокім тварам і шэрымі сур'ёзнымі вачыма. У палку ён лічыўся лепшым камандзірам гарматы.

Спачатку нічога асаблівага я ў ім не заўважыў. Гэта быў звычайны чалавек, які любіў успамінаць сваю вёску і нейкае Маркава Лядо, на якім, як ён казаў, родзяць вельмі добрыя аўсы і ячмяні. Яго гаворка заўсёды была пра гаспадарку. Ён любіў расказваць, на якой глебе якую збажыну варта і не варта сеяць, якая культура выгадная, і пазіраў на ўсё вокам гаспадарлівага селяніна. Памятаю, што ён тады мне нават і не спадабаўся. У той дзень здарылася так, што нейкі баенавічок не так, як трэба было, зачапіў за валёк пастромак. Памылку старшына заўважыў ужо на маршы, спыніў коней, сам перачапіў пастромак, і доўга стаяў ля таго байца, нездаволена і надакучліва бурчэў, як стары сварлівы дзед. Мне здавалася, што ў той час ён і сапраўды ненавідзеў таго навічка...

У адну з цёмных начэй лістапада наш узвод спыніўся на ўзлессі, кіламетры за чатыры ад перадавой. Час-ад-часу ў тым баку, у небе, загараліся зялёныя і жоўтыя ракеты. Мёртвае святло фосфару выхватвала тады з цемені хмызнякі, рэшткі нейкай абсмаленай будыні-ны на небасхіле і поле з патэптанай нязжатай збажынай.

Дзьмуў халодны пранізлівы вецер, няспынна ішоў дождж. Амаль паўночы сяклі мы лес і маскіравалі вецем свае гарматы. Потым ужо толькі ўтраіх рушылі на перадавую выбіраць месца для стральбы з гармат прамой наводкай. Мы ішлі там полем, і Захар Ляшчак, які крочыў першым, увесь час бурчэў, што вось гэтулькі пасеялі збажыны і добрая ўрадзіла, а прапала. Вельмі часта над нашымі галовамі свісталі кулі, і слухаць у такі час пра збажыну, вытаптаную салдацкімі нагамі, у нас не было аніякага жадання. Але старшына, відаць, зусім і не цікавіўся гэтым.

Можа за кіламетр ад перадавой мы заляглі і папаўзлі. На світанні апынуліся ля траншэй, занятых пяхотай. Тут быў невялікі ўзгорачак, і мы аблюбавалі яго для сваіх гармат. Мне здаецца, што і цяпер я пазнаў-бы той невялікі кавалачак ржэўскай зямлі. Наперадзе яго былі нашы траншэі і «нічыя» лагчына. Далей на ўзвышшы, абчэпленым дротавымі загародамі, цягнуліся яшчэ траншэі, але ўжо не нашы, а нямецкія. Злева ляжала іржавае балота, у якім моклі вецці пераспелай арабіны...

Тут мы працавалі ўсім узводам і ўдзень і ўначы. На занятае немцамі ўмацаванае ўзвышша рыхтавалася наступленне, і ноччу ўвесь пярэдні край нашае абароны раптам ажываў. Мы капалі акопы для гармат і нішы для спарадаў, пяхота — новыя траншэі, якія ўжо заходзілі на «нічыю» зямлю. На світанні ўсё маскіравалася, і пярэдні край заціхаў. Але гэта так толькі здавалася. У сапраўднасці-ж з усіх акопаў і траншэй за ўзвышшам сачылі сотні пільных вачэй совецкіх разведчыкаў.

Чатыры дні і чатыры ночы працавалі мы на сваім узгорку, і тут я вымушаны быў здзівіцца вынослівасці і ўпартасці старшыны Захара Лешчака. За ўвесь гэты час ён толькі днём на некалькі хвілін засынаў, а між тым, меў бадзёры, нават вясёлы выгляд.

— Націскай, хлопцы! — казаў ён нам так, як казаў-бы касцам, каторыя адсталі ў пакосе. — К святу немцу падаруначак падрыхтуем — сто год будзе памятаць!..

На чацвертую ноч мы падцягнулі і паставілі тут свае гарматы, загрузілі нішы снарадамі і пачалі чакаць дня.

Гэта была ноч напярэдадні 25 гадавіны Вялікага Кастрычніка. Людзі не спалі. Апоўначы, мінаючы нас, наперад, у цемень, прапаўзло некалькі ланцугоў нашай пяхоты. Потым зноў усё заціхла і толькі часам з таго ўзвышша, за якое хутка пачнецца бой, немцы стралялі трасіруючымі кулямі. Ім не адказвалі.

Так прышло світанне і той новы дзень — сёмага лістапада, які прынёс нам перамогу... Спачатку над пярэднім краем адна за другой узляцелі ў неба тры чырвоныя ракеты і, раптам, адначасова ўдарылі сотні гармат. Нейкі момант — і няспынны гул і грукат стаяў ужо над зямлёю. У траншэях, нішах і акопах пачалі асядаць накаты і пасыпаўся пясок. Усё ўзвышша, абчэпленае немцамі дротавымі загародамі, было падобна цяпер на вялікую чорную галавешку, якая гарэла і густа капціла неба.

Старшына Захар Ляшчак, чалавек, якога я моцна палюбіў у гэты дзень, быў непазнавальны. Нейкая ўрачыстасць і радасць свяціліся на яго ўзбуджаным твары. Ён сам наводзіў гармату, сам страляў. Напэўна, што ў гэты час ён успамінаў жонку, сына і маці, тыя палі, якія любіў і на якіх яму не даў спакойна працаваць люты вораг. Відаць было, што ён радаваўся кожнаму свайму трапнаму стрэлу...

Мінула пяць, дзесяць хвілін, а артылерыйскі агонь усё мацнеў. Толькі, пэўна, праз гадзіну наша пяхота пайшла ў атаку. Яна ішла правільнымі ланцугамі і ўзбіралася ўсё вышэй і вышэй, несучы разам з сабою многагалосае «ура».

ПІСЬМЕННІЦКІ ПАРАД

Рашыў зрабіць у свята Колас
Літаратурных сіл агляд.
— Міхась Лынькоў!—
узняў ён голас.—
На плошчы выстрай свой атрад.

Ты дзесяць год рыхтуеш пленум,
вяселляў колькі адгуло.
Паглядзім хоць, як наша племя
у навальніцах узрасло...

Лынькоў узняўся і, панары,
як гаркне:
— В'юнашы, ўпярод!..
На кліч бяжыць,
ляціць алюрам,
ідзе пісьменніцкі народ.

Для шчасця цэлага атрада
звініць вязанкамі падкоў,
узняўшы слаўны «Сцяг брыгады»,
цымбальны майстра Куляшоў.

Не трэба гэткаму Пегасу
аўса і добрае травы:
імчыцца горда да Парнаса
аўто Кандрата Крапівы...

Дзе Кучар?
Крытыкі ў адчаі—
збег хлопец да Міная ў лес,
цяпер заложнікам блукае
па сцэнах БДТ Алесь.

Крычаць паэты:
— Страта, страта...
Знік Глебка,
здрадзіў ім Пятро,
зламаўшы на млыне трактатаў
сваё лірычнае пяро.

У Броўкі, браткі, лёс нялёгкі—
згасае «Полымя»,
і ён
ляціць з рэдактарскай дамоўкі
у «Ясны Кут» на пару дзён.

Тут рэжа Танк паэмы — скібы,
на крытыку нагнаўшы страх.
Захроп, чытаючы «Сялібу»,
паэт-празаік П. Пестрак.

— Што? Згаслі ў бардаў нашых сілы?
Які дзівак, калі сказаў?!—
сваю лірычную кабылу
Міхась Машара закілзаў.

Ідуць з палян лясных салдаты.
Адрозні іх! Адной сям'і...
Астрэйка, Краўчанка заўзяты
з каманды Гурскага Ільі.

Як вораг творчага спакою
і знаўца нашай старыны,
загруз Клімковіч з галавою
у пыльных скарбах Скарыны.

Сядзіць Крысько з кляновым тузам
і песціць-кволіць у траве
з завіўкай перманентнай Музу,
якую Зосяю заве.

З сівых вякоў брыдзе патроху
Віталі Вольскі — скамарох,
пытае Вітку і Цімоха,
фальклорны шчыплючы гарох:

— Што за птахі маладыя
крылле квола узнялі?..
— То Бялевіч і другія—
«матылі ўсё, матылі»...

Стаіць Стаховіч ля дарогі,
трасе сасёначку бядак,
каб зашумеў на ўсе разлогі
пабіты Гіраю хмызняк.

Хто не чытаў
ніколі оды
аб ножках розных Карменсіт,
Паслухай!
Вось таварыш
Модэль,
балета нашага піт.

А Панчанка з-за меж Радзімы,
як клён цудоўна-залаты,
то сыпле верш на адрас «ЛІМ'а»,
то сыпле добрыя лісты.

Канец параду і размове.
Ідуць пасля вясёлых сцэн
дзед—Маур, Шура Якімовіч
і невядомы

Я. БЯЗМЕН.

Сяброўскі шарж мастака Л. Бойкі.

Рэдкалегія: Л. АЛЕКСАНДРОЎСКАЯ, А. БАГАТЫРОЎ, Г. ГЛЕБАЎ, Я. КОЛАС, А. КУЛЯШОЎ (адказны рэдактар), А. КУЧАР, П. ПЕСТРАК.

АТ—30441 Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Рэвалюцыйная, 3. Друкарня «Чырвоны Друкар», Рэвалюцыйная, 12.